Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

2 КРАСАВІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 62 (27920) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Чытачы «Звязды» — аб праблемах школы

СТАР. 4

«Прамая лінія» адбылася ў... калоніі

СТАР. 7

Грузія на смак, або адна закуска — 200 варыяцый

СТАР. 13

ЛІЧБА ДНЯ

Да 9-12%

можа замарудзіцца інфляцыя ў Беларусі на канец 2015 года. Пра гэта гаворыцца ў чарговым «Макраманіторы СНД», апублікаваным Аналітычным упраўленнем Еўразійскага банка развіцця (ЕАБР). На думку аналітыкаў, змены ў макраэканамічнай палітыцы Беларусі спрыялі павелічэнню ступені ўстойлівасці эканомікі. Калі Нацбанк Беларусі зможа пазбегнуць істотнай дэвальвацыі нацыянальнай валюты, можна чакаць, што інфляцыя ў краіне замарудзіцца. Па выніках студзеня забяспечаны прафіцыт бюджэту органаў дзяржкіравання. Паляпшэнне стану бюджэту было дасягнута, у прыватнасці, дзякуючы намаганням па эканоміі выдаткаў.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.04.2015 г.

Долар ЗША	14720,00	▲
Еўра	15820,00	▼
Рас. руб.	252,50	▼
Укр. грыўня	628,72	▲

ISSN 1990 - 763X

ГЛОБУС — БЕЛАРУСІ!

Фота БЕЛТА.

ДАР'Я ДОМРАЧАВА ПРЫВЕЗЛА Ў МІНСК ВЯЛІКІ ХРУСТАЛЬНЫ ГЛОБУС

Урачыстая сустрэча пераможцы агульнага заліку Кубка свету па біятлоне сезона 2014/15 Дар'і Домрачавай і членаў жаночай зборнай Беларусі адбылася ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. СТАР. 5

■ Азбука бяспекі

КІРОЎЦЫ, РУКІ НА РУЛЬ!

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя па 10 красавіка ўзмоцніць кантроль над кіроўцамі транспартных сродкаў, якія карыстаюцца падчас руху апаратамі радыё- і тэлефоннай сувязі, не абсталяванай тэхнічнымі прыладамі, што дазваляюць весці перамовы без выкарыстання рук.

— Выкарыстанне мабільнага тэлефона павялічвае рызыку аварыі. Адцягваючы ўвагу на ўваходны званок, кіроўцы рызыкуюць не толькі сваім жыццём, але і жыццямі навакольных людзей, — сказалі ў прэс-службе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. — Нагадваем, што за парушэнне правілаў карыстання радыё- і тэлефоннай сувяззю падчас руху (за выключэннем кіроўцаў транспартных сродкаў апаратыўнага прызначэння) на кіроўцу накладаецца штраф у памеры да дзвюх базавых велічынь, за паўторнае такое ж парушэнне цягам года — штраф у памеры ад дзвюх да васьмі базавых велічынь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Рабі, як мы!

ХТО ВЯСКОЎЦУ ДАПАМОЖА?

Валожынскія бытавікі не толькі адрамантуюць абутак, але і апрацуюць участак

Апошнім часам на Міншчыне ўсё больш вяскоўцаў адмаўляюцца ад уласных падсобных гаспадарак. Зрэшты, такі працэс назіраецца і ва ўсёй краіне. На гэта ўплывае дэмаграфічная сітуацыя. Сельскае насельніцтва змяншаецца і старэе. У шмат якіх, так званых неперспектыўных вёсках, засталіся практычна адны пажылыя людзі. Яны прывычныя да працы, усё жыццё трымалі ўласную гаспадарку. Цяпер жа, як правіла, на падворку толькі куры. Не пад сілу спраўляцца з тымі клопатамі — не тое здароўе. Тут хоць бы прысядзібны ўчастак своечасова засеяць. Сельгасарганізацыі, дзе яны раней працавалі, выдзяляюць тэхніку, але толькі пасля, як самі адсеюцца.

— Мы разумеем, што ў сельскай мясцовасці засталіся практычна адны пенсіянеры, і імкнёмся аказваць ім сацыяльна значныя паслугі. Для гэтага маем неабходную тэхніку: тры машыны «Газель», трактар для апрацоўкі ўчасткаў. Ёсць і пагрузчык, так што можам і дровы даставіць, і гной на поле вывезці за прымальны кошт. Расцэнкі ўвязваем толькі з павышэннем цэн на паліва, — распавёў **дырэктар Валожынскага камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва Леанід АКОТЧЫК.** — Напрыклад, у мінулым годзе заараць адну сотку каштавала 15 тысяч рублёў. СТАР. 9

Асаблівая каштоўнасць адзінства

Дарагія беларусы і расіяне!

Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі — знамянальная дата ў нашай агульнай гісторыі, яркі сімвал нашага братэрства. У Саюзнай дзяржавы ёсць трывалая аснова — багатая духоўная і культурная спадчына, маштабны эканамічны патэнцыял супрацоўніцтва, разгалінаваныя міжасобасныя сувязі.

Асаблівасць сённяшняга свята ў тым, што яно адзначаецца напярэдадні лёсавызначальнай даты — 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Менавіта тады ў жорсткіх бітвах савецкі народ абараніў свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы і вызваліў ад фашысцкага рабства ўсю Еўропу.

Сумеснымі намаганнямі мы беражліва захоўваем і перадаём нашчадкам памяць аб вялікіх здзяйсненнях пакалення пераможцаў. Разам стараемся супрацьстаяць спробам, якія робяцца ў апошні час, фальсіфікацыі гісторыі і прыніжэння значнасці іх беспрэцэдэнтнага подзвігу.

Гісторыя неаднаразова даказвала — толькі разам мы здольныя годна адказаць на любыя выклікі і пагрозы. Сёння, калі міжнародная супольнасць перажывае складаны час канфліктаў і крызісаў, наша адзінства мае асаблівую каштоўнасць.

Амаль 20 гадоў прайшло з моманту падпісання першага беларуска-расійскага інтэграцыйнага дагавора. Гэта быў часам складаны, але вельмі плённы і багаты на добрыя справы перыяд. Прыемна таксама, што саюзны праект даў штуршок іншым інтэграцыйным працэсам — з пачатку гэтага года пачаў дзейнічаць Еўразійскі эканамічны саюз.

У нашых краін ёсць безумоўнае разуменне неабходнасці далейшага развіцця саюзнага будаўніцтва і, самае галоўнае, бачанне яго перспектыў. Упэўнены, што непарушная дружба, узаемны давер і разуменне заўсёды будуць для беларусаў і расіян галоўнымі арыенцірамі на выбраным шляху.

Дарагія сябры!

Сардэчна зычу ўсім, хто жыве ў нашым агульным доме, мірнага неба над галавой, плённай працы, згоды і дабрабыту, моцнага здароўя, дасягнення пастаўленых мэтаў.

Старшыня Вышэйшага Савета Саюзнай Дзяржавы,
Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.
2 красавіка 2015 года

ПРАКТЫЧНЫЯ ВЫНІКІ ІНТЭГРАЦЫІ

Саюзная дзяржава застаецца самым паспяховым інтэграцыйным утварэннем на постсавецкай прасторы

Самая вялікая лічба таваразвароту ў Беларусі з Расіяй, самая вялікая працягласць нашай дзяржаўнай мяжы таксама з гэтай краінай, менавіта ў Расіі знаходзіцца самая вялікая беларуская дыяспара і менавіта туды сёння можна з'ездзіць без візы і без кантролю на мяжы. Тое, што абедзве дзяржавы пасля распаду Савецкага Саюза вырашылі захаваць ранейшыя сувязі і наладзіць новыя, не стала вялікай навіной для большасці беларусаў і расіян. 2 красавіка 1996 года прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Барыс Ельцын падпісалі дакумент аб стварэнні супольнасці Беларусі і Расіі, якая з часам перарасла ў самае паспяховае на тэрыторыі СНД інтэграцыйнае аб'яднанне пад назвай Саюзная дзяржава.

Фота БЕЛТА.

Напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі і Расіі карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з дэпутатам **Мікалаем САМАСЕЙКАМ, старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі.**

— Якія, на вашу думку, асноўныя дасягненні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі за ўвесь час яе існавання?

— Будаўніцтва Саюзнай дзяржавы ажыццяўлялася планамерна па ўсіх напрамках інтэграцыі, як у эканоміцы, так і ў сацыяльнай сферы. Атрыманы важныя практычныя вынікі, якія адназначна служаць інтарэсам грамадзян Беларусі і Расіі.

У рамках Саюзнай дзяржавы адноўлены і атрымалі далейшае развіццё вытворчыя кааперацыйныя сувязі былых саюзных рэспублік, якія дазваляюць больш граматна, рацыянальна і эфектыўна выкарыстоўваць матэрыяльныя, фінансавыя і чалавечыя рэсурсы нашых краін.

Думаю, што галоўнае дасягненне Саюзнай дзяржавы — гэта тое, што грамадзяне нашых краін адчуваюць сябе на тэрыторыях Беларусі і Расіі спакойна, камфортна і не як замежнікі.

— Якая роля гэтага інтэграцыйнага аб'яднання сёння, калі галоўным аб'яднаннем для нашай краіны на постсавецкай прасторы стаў Еўразійскі саюз?

— Я не стаў бы сцвярджаць, што Еўразійскі эканамічны саюз стаў галоўным аб'яднаннем для нашай краіны. Мы цвёрда прытрымліваемся палітыкі шматвектарнасці ў нашых знешніх справах.

Сёння Саюзная дзяржава карыстаецца рэпутацыяй найбольш паспяховага інтэграцыйнага ўтварэння на постсавецкай прасторы — у эканамічнай, ваеннай, сацыяльнай сферах і ў галіне знешняй палітыкі.

Важны геапалітычны момант Саюзнай дзяржавы — тое, што яна выступае лакаматывам еўразійскай інтэграцыі і можа стаць пляцоўкай, дзе будуць браць свой пачатак праекты Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Раскажыце пра работу Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі. Якія яго задачы? Наколькі эфектыўны гэты орган?

— За час, які прайшоў з моманту ўтварэння ў красавіку 1996-га Супольнасці (з красавіка 1997 года — Саюза Беларусі і Расіі, са снежня 1999 года — Саюзнай дзяржавы), дэпутаты Парламенцкага сходу здзейснілі працу, якая заклала асновы фарміравання прававой сістэмы Саюзнай дзяржавы.

Дзейнасць Парламенцкага сходу арыентавана на разгляд пытанняў будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, збліжэнне заканадаўстваў Беларусі і Расіі, развіццё беларуска-расійскага дыялогу. Беларускія парламентарыі прымаюць актыўны ўдзел у пасяджэннях профільных камісій Парламенцкага сходу, пастаянна дзеючых семінарах і мерапрыемствах Саюзнай дзяржавы, якія праходзяць як на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, так і ў Рэспубліцы Беларусь.

Кажучы больш прадметна, 4-5 снежня 2014 года ў Сочы адбылася 47-я сесія Парламенцкага сходу Саюзнай дзяржавы. У ёй узяла ўдзел парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам. У рамках мерапрыемства адбыліся два пленарныя пасяджэнні, а таксама пасяджэнні васьмі камісій, Савета Парламенцкага сходу, пагаджальнай камісіі па бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2015 год. Дэпутаты асабліва значэнне надаюць працы з бюджэтам Саюзнай дзяржавы. Мы звяртаем асаблівую ўвагу на захаванне сацыяльнай накіраванасці бюджэту, фінансаванне праграм у сферы аховы здароўя, адукацыі і культуры. Частка сродкаў, вядома ж, накіроўваецца на фундаментальныя даследаванні і садзейнічанне навукова-тэхнічнаму прагрэсу, развіццё прамысловасці і энергетыкі, транспарту і сувязі.

У гэтым годзе мы таксама актыўна працуем. Напрыклад, 25 сакавіка ў Нясвіжы адбылося пасяджэнне камісіі Парламенцкага сходу па заканадаўстве і рэгламенце, 26—27 сакавіка ў Гомелі — пасяджэнне Камісіі Парламенцкага сходу па эканамічнай палітыцы. Чарговая 48-я сесія Парламенцкага сходу пройдзе ў Беларусі сёлета ў чэрвені, як плануецца, у Гродне.

— У Беларусі і Расіі наладжаны цесныя сувязі практычна ва ўсіх галінах эканомікі, навукі, культуры. Расія для нас — партнёр нумар адзін. Аднак перыядычна ўзнікаюць некаторыя канфліктныя сітуацыі, якія ў выніку наносяць нашай краіне эканамічны ўрон. У чым, на ваш погляд, корань гэтых праблем? Няўжо краінам, настолькі блізкім у палітычным, эканамічным планах, так складана знайсці агульную мову?

Вы не знойдзеце ніводнай краіны ў свеце, якая б не мела праблемных пытанняў з суседзямі. Нават на абывацельскім узроўні, нават на адной лесвічнай пляцоўцы часцяком суседзі сварацца, а гэта ўсяго толькі дзве сям'і... Уяўляеце, колькі розных і супярэчлівых пытанняў на міждзяржаўных узроўнях?

— Думаю, што вы не знойдзеце ніводнай краіны ў свеце, якая не мела б праблемных пытанняў з суседзямі. Нават на абывацельскім узроўні, нават на адной лесвічнай пляцоўцы часцяком суседзі сварацца, а гэта ўсяго толькі дзве сям'і... Уяўляеце, колькі розных і супярэчлівых пытанняў на міждзяржаўных узроўнях? Таму я лічу, што без праблем нам не абысціся. Галоўнае, вырашаць іх правільна і своечасова.

— Якія напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва маюць патрэбу ў развіцці?

— Трэцяга сакавіка адбылося пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. Прынятыя на ім дакументы носяць стратэгічны характар. Зацверджаны прыярытэтныя напрамкі і першачарговыя задачы развіцця Саюзнай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву да 2017 года, дасягнуты шэраг дамоўленасцяў па стварэнні адзінай візавай прасторы, падпісаны пагадненні ў сферы сацыяльнай і міграцыйнай палітыкі, а таксама разгледжаны план мерапрыемстваў урадаў Беларусі і Расіі па паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Важна развіваць рэгіянальны складнік. Пра гэта гаварыў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з губернатарам Арэнбургскай вобласці Юрыем Бергам. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Мінск і Масква ў рэгіянальным узаемадзеянні павінны актыўна шукаць новыя пункты сутыкнення ва ўмовах запаволення эканамічнага развіцця ў рэгіёне.

Натуральна, у аснове нашага інтэграцыйнага аб'яднання павінна стаяць эканоміка. Расійская Федэрацыя застаецца асноўным гандлёвым партнёрам Рэспублікі Беларусь, яе доля ў таваразвароце Беларусі ў 2013-м склала 49,5%, у 2014 годзе — 48,8%. Беларусь таксама з'яўляецца адным з асноўных гандлёвых партнёраў Расійскай Федэрацыі і займае пятае месца па аб'ёмах таваразвароту сярод краін свету і першае сярод краін СНД. Доля Беларусі ў таваразвароце Расіі ў 2014-м склала 4,8%, у экспарце — 4,5%, у імпарце — 5,3%.

— Нягледзячы на тое, што Саюзная дзяржава праводзіць актыўную праінфармацыйную кампанію, накіраваную на інфармацыйнае забеспячэнне супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, звычайныя людзі, здаецца, мала цікавяцца дзейнасцю гэтага інтэграцыйнага аб'яднання.

— Хацелася б з вамі не пагадзіцца. Думаю, праблемы тут няма. Досыць шмат людзей ведаюць аб Саюзнай дзяржаве і ў Беларусі, і Расіі. Мы вельмі глыбока інтэграваныя.

Важна сказаць, што Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі дастаткова шырока адзначаецца ў дзвюх краінах. Напрыклад, больш за 150 дзяцей узялі ўдзел у фестывалі-конкурсе «Дзве сястры: Беларусь і Расія» ў Віцебску, 16 красавіка ў Гродзенскай вобласці пройдзе адзіны дзень інфармавання насельніцтва, адной з тэм якога стане «Саюзная дзяржава: праблемы і перспектывы».

На Камчатцы Дзень яднання адзначаюць танцамі і вершамі, у Тальяці на святкаванні ганаровымі гасцямі становяцца беларусы (галоўны герой канцэрта ў Тальяці — мясцовы ансамбль беларускай песні «Купалінка»), у Ніжнім Ноўгарадзе таксама арганізуецца канцэрт, прымеркаваны да Дня яднання.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ Парламенцкі дзённік

Змяніць і палепшыць

На сёлетняй вясновай сесіі плануецца прыняць у першым чытанні законапраект «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці». Змены і дапаўненні, унесеныя ў яго, абмеркавалі падчас «круглага стала» сенатары, дэпутаты, а таксама прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі і Беларускай натарыяльнай палаты.

1 студзеня 2014 года Указам Прэзідэнта Беларусі №523 беларускія натарыусы перайшлі на самакіраванне і самафінансаванне. Такім чынам ліквідавалася дзяленне натарыусаў на тых, хто працуе ў дзяржаўных і прыватных структурах.

«Цяпер ёсць натарыяльная кантора — гэта своеасаблівыя таварыствы, ранейшыя дзяржаўныя аддзяленні. У іх усе спецыялісты працуюць разам. А натарыяльнае бюро — ранейшыя камерцыйныя структуры. У іх натарыусы працуюць кожны індывідуальна», — тлумачыць **Лілія МАРОЗ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.** Са слоў Ліліі Францаўны, толькі тыя, хто адпрацаваў 2 гады ў канторы, змогуць пры жаданні перайсці ў бюро.

Змены будуць датычыцца не толькі натарыяльных аб'яднанняў, але і дзяржаўных структур. «Асобныя артыкулы прадугледжваюць у тым ліку і кампетэнцыі Міністэрства юстыцыі. Паколькі натарыусы практычна выведзены з яго падначалення, міністэрства будзе ажыццяўляць толькі кантрольныя функцыі за іх працай», — расказала **Наталля ГУЙВІК, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў.**

Таксама, згодна з законапраектам, дакладна вызначаны асобы, якія могуць займацца натарыяльнай дзейнасцю. Гэта натарыусы, упаўнаважаныя службовыя асобы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дыпламатычныя агенты дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскія службовыя асобы консульскіх установ.

У першым чытанні законапраект «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» плануецца прыняць напрыканцы мая — пачатку чэрвеня гэтага года.

Вераніка ПУСТАВІТ

■ Геапалітыка

ПРАЦЯГ ДЫЯЛОГУ

Ініцыятыва Усходняга партнёрства будзе перазапушчана

Якія перспектывы ёсць у адносін Еўрасаюза і нашай краіны, як можна наладзіць супрацоўніцтва паміж ЕС і Еўразійскім саюзам і што значыць для Беларусі Усходняе партнёрства? З мэтай знайсці адказы на гэтыя пытанні нашу краіну наведала дэлегацыя экспертаў Еўрапейскага савета па міжнародных адносінах. На днях эксперты савета — прадстаўнікі Бельгіі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Нарвегіі, Славакіі, Францыі, Швецыі, Эстоніі — сустрэліся з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.

— Тыя пазітыўныя бакі, якія вы адкрываеце для сябе ў Беларусі, заўсёды прысутнічалі ў нашай краіне, — заявіў падчас сустрэчы **Мікалай САМАСЕЙКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах.** — Можа быць, яны не заўсёды былі відаць, але наша краіна заўсёды была шчыра зацікаўлена ў нармальных узаемавыгадных адносінах з Еўрапейскім саюзам.

Паводле слоў парламентарыя, павышаная цікавасць да Беларусі ў нашых заходніх партнёраў у першую чаргу абумоўлена тым, што цяпер адбываецца ва Украіне, той пазіцыяй, якую Беларусь заняла ў дачыненні да гэтага канфлікту.

У сваю чаргу эксперт з Вялікабрытаніі **Чарлз ГРАНТ, дырэктар Цэнтра еўрапейскіх рэформаў, публіцыст і палітолаг**, адзначыў:

— Я і мае калегі хочам даведацца, наколькі добрыя перспектывы па пашырэнні нашага супрацоўніцтва з улікам таго канфлікту, які разгарэўся ва Украіне. Першае пытанне, якое мы абмяркуем з шаноўнымі беларускімі калегамі, — гэта тое, як Еўрапейскі саюз можа дапамагчы Рэспубліцы Беларусь у сітуацыі санкцый супраць Расіі. Мы хочам абмеркаваць, якога кшталту дапамогі вы чакаеце ад нас — напрыклад, тэхнічнай або фінансавай. Другое пытанне, якое мы ўзнімаем — гэта ўзаемадзеянне паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Еўрапейскім саюзам.

— Я ведаю пра тое, што Беларусь робіць значныя намаганні для таго, каб прывесці бакі да дамоўленасцяў наконт мірнага вырашэння канфлікту ва Украіне, — адзначыў Чарлз Грант. — Краіны ЕС таксама жадаюць добрых, партнёрскіх стасункаў паміж Еўрасаюзам і Рэспублікай Беларусь.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Факт

ДАРОГІ ПРЫВЯДУЦЬ У ПАРАДАК

Да 20 красавіка дарожнікі павінны навесці парадак на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах, падрыхтаваўшы іх да летняга сезона.

У адпаведнасці з загадам Мінтранса, у першую чаргу павінна быць ліквідавана сезонная ямачнасць. Пры гэтым даручаецца забяспечыць строгае захаванне тэхналогіі і якасці пры выкананні такога рамонту, не дапускаючы выпадкаў пакідання па заканчэнні рабочых змен незавершанай работы на ўчастках дарог.

На рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах ужо ліквідавана сезонная ямачнасць пакрыццяў праезнай часткі дарог і мастоў у аб'ёме больш за 105 тысяч квадратных метраў, пафарбавана каля 110 кіламетраў бар'ернай і 30 кіламетраў поручневай агароджы. Ачышчана ад смецця 23 тысячы кіламетраў палос адводу, заменена каля дзвюх тысяч дарожных знакаў, устаноўлена амаль 50 тысяч сігнальных слупкоў, адрамантавана больш за тысячу аўтапавільёнаў. Асаблівая ўвага надаецца аўтадарогам, якія знаходзяцца ў 50-кіламетровай зоне вакол Мінска.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТРАДЫЦЫЙНА ПА СУБОТАХ

Працягваюцца прамыя тэлефонныя лініі

Штотыдзень ужо некалькі месяцаў запар улады адказваюць на пытанні грамадзян ва ўсіх рэгіёнах краіны. Як паказвае практыка, для беларусаў гэта выдатная магчымасць не толькі расказаць пра сваю праблему, але і неадкладна яе вырашыць.

На гэтым тыдні, 4 красавіка, з 9-ці да 12-ці гадзін на сувязь выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам

Юхімук Міхаіл Іванавіч — першы намеснік старшыні; 80162213121

Віцебскі аблвыканкам

Цярэнцьеў Уладзімір Уладзіміравіч — намеснік старшыні; 80212204260

Гомельскі аблвыканкам

Клічкоўская Алена Уладзіміраўна — кіраўнік спраў; 80232751237

Гродзенскі аблвыканкам

Жук Ігар Георгіевіч — старшыня абласнога Савета дэпутатаў; 80152735644

Мінскі аблвыканкам

Плаўскі Алег Альфрэдавіч — намеснік старшыні; 5004160

Магілёўскі аблвыканкам

Ісачэнка Анатоль Міхайлавіч — старшыня абласнога Савета дэпутатаў; 80222501869

Мінскі гарвыканкам

Лапцеў Віктар Сяргеевіч — намеснік старшыні 2224444.

■ Ну і ну!

СКРАЎ ЗАПЛЕЧНІК З ДОЛАРАМІ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы вышукваюць мужчыну, які падазраецца ў крадзяжы заплечніка, у якім знаходзілася шэсць тысяч долараў.

У міліцыю звярнуўся малады чалавек, які расказаў, што з яго незамкнутай кватэры знік заплечнік, у якім былі грошы. У той дзень ён зняў іх у банку, паклаў у заплечнік і прыйшоў дадому. У кватэры пакінуў заплечнік у калідоры, але забыўся зачыніць дзверы. Праз нейкі час хлопец убачыў, што рэчаў на месцы няма. Супрацоўнікі міліцыі высветлілі, што напярэдадні здарэння ў пад'ездзе дома знаходзіўся невядомы мужчына. Пры праглядзе запісаў з камер відэаназірання відаць, як той выходзіць з пад'езда прыкладна праз гадзіну, як дадому вярнуўся пацярпелы малады чалавек. У руках гэтага грамадзяніна быў зніклы з кватэры маладога чалавека заплечнік.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ А не шкодзь!

«ЖЫВАДЗЁРАМ» — ПА РУКАХ

Толькі за апошні месяц дзяржінспектары склалі каля 20 пратаколаў у адносінах да парушальнікаў, якія рыбачылі спосабам багрэння.

— Гэта забаронены спосаб лоўлі рыбы з выкарыстаннем кручковых прылад рыбалоўства, пры якім лоўля вядзецца не на прынаду, а шляхам захопу рыбы кручком за любую частку. Пры гэтым многія асобіны траўміруюцца і гінуць, не трапляючы ва ўлоў. У народзе такіх «рыбакоў» называюць жывадзёрамі, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі Вольга Грамовіч. — Заканадаўствам за такую лоўлю прадугледжаны немалы штраф — да 50 базавых велічынь (9 мільёнаў рублёў) плюс пакрыццё шкоды. Калі ж памер апошняй складзе больш за 100 базавых велічынь, парушальнік становіцца фігурантам крымінальнай справы. Як, напрыклад, жыхар вёскі Алекшыцы Мастоўскага раёна, які спосабам багрэння «рыбачыў» на затоцы ракі Нёман. Апроч іншай рыбы, браканьер вылавіў і некалькі асобін звычайнага рыбца, што ўключаны ў Чырвоную кнігу. Суд прыгаварыў яго да года пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Агонь не шкадуе

ТРАГЕДЫЯ Ў ШКЛОВЕ

У агні загінулі двухгадовы Глеб, яго дзед і прадзед — ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

Бяда пастукалася ў дзверы жылога дома па вуліцы Камсамольскай сярод белага дня. Паведамленне аб пажары паступіла ратавальнікам а чацвёртай гадзіне. Калі на месца здарэння прыбылі першыя разлікі, гарэлі веранда і дах. Суседзі падказалі, што ў хаце могуць быць людзі. Праз некалькі хвілін у адным з пакояў быў знойдзены мужчына, які ляжаў на падлозе каля дзіцячага ложка. Здавалася, яму не хапіла аднаго кроку, каб схапіць маленькага ўнука і вынесці з гэтага пекла. Малога спрабавалі рэанімаваць, але, на жаль, безвынікова. І ён, і яго дзед загінулі. Яшчэ адной ахвярай стаў паралізаваны 90-гадовы ветэран вайны. Яго цела было знойдзена на канапе ў суседнім пакоі.

У доме таксама жылі маці двухгадовага Глеба і яго бабуля. На момант пажару адна знаходзілася ў паліклініцы, а другая на працы. Жанчыны не толькі засталіся без самых блізкіх родных, але і без даху над галавой. Ім аказваецца псіхалагічная дапамога, часовы прытулак яны пакуль што знайшлі ў родных.

Прычына трагедыі высвятляецца. Па адной з версій, да пажару магло прывесці неасцярожнае абыходжанне з агнём, або няспраўная праводка. Раённым аддзелам СК прызначаны шэраг экспертыз.

Як паведаміла старшы інспектар Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вольга Нехарошых, сёлета гэта першы выпадак у вобласці, калі на пажары загінула непаўналетняе дзіця, і пяты па краіне.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

«ВОЖЫК» ВОСТРЫЦЬ КАЛЮЧКІ!

Так сказаў вядомы беларускі мастак-карыкатурыст, мэтр жанру Мікола Гіргель на адкрыцці выставы сваіх работ у Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

У першыя дні красавіка некалькі гадоў запар пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі ў Мінску ладзяцца выставы гумарыстычнага малюнка і карыкатуры. У мінулыя гады ўвагу да беларускай карыкатуры прыцягвалі выставы заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргея Волкава, папулярнага карыкатурыста часопіса «Вожык» Аляксандра Каршакевіча. Цікавымі былі сумесныя выставы «Вожыка» і газеты «Звязда», выстава «СпARTыўныя ўсмешкі».

Учора гледачам была прадстаўлена вялікая калекцыя карыкатур Міколы Гіргеля — члена Саюза мастакоў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў, выдатніка друку Беларусі, прызёра шматлікіх конкурсаў карыкатур, шаржаў, плакатаў.

Малюнкі Міколы Гіргеля знаёмыя аматарам гумару яшчэ з 1973 года — па яго першых публікацыях у часопісе «Вожык». З тых далёкіх дзён мінскі карыкатурыст стаў вядомым ва ўсіх краінах СНД, Балгарыі, Польшчы, Бельгіі. У «Бібліятэчцы «Вожыка» выйшлі дзве яго кнігі карыкатур. У 1998 годзе за серыю малюнкаў у газеце «Рэспубліка» (дзе ён працуе больш за 20 гадоў) Мікола Гіргель стаў лаўрэатам прэміі Беларускага саюза журналістаў.

Што датычыцца флагманскага выдання айчынных сатырыкаў і гумарыстаў часопіса «Вожык», то аўтар красавіцкай выставы сказаў шмат добрага пра папулярнасць гэтага часопіса ва ўсе часы. Шматлікія падобныя выданні ў Савецкім Саюзе выходзілі ва ўсіх рэспубліках вялікімі накладамі, але потым яны не вытрымалі выпрабаванняў часам і зніклі з медыяпрасторы. Беларускі «Вожык» паспяхова працягвае калоць сваімі іголкамі дармаедаў, п'яніц, казнакрадаў і шмат каго яшчэ — тых, хто перашкаджае грамадству. Праца «вожыкаўцаў» запатрабаваная, і выконваюць яе першакласныя майстры.

Гэту цікавую выставу арганізавалі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Выдавецкі дом «Звязда», часопіс сатыры і гумару «Вожык».

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

«ВЕЧНАЯ ВЯСНА» ВОЛЬГІ ДАНІЛАВАЙ

На часопісы Выдавецкага дома «Звязда» магілёўскія чытачы нават займаюць чаргу

Дэбютную кнігу вершаў паэтэсы са Шклоўшчыны Вольгі Данілавай прадставіў на нядаўняй сустрэчы ў Магілёве рэдактар аддзела літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя» Рагнед Малахоўскі. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў таленавітых аўтараў заўсёды ёсць шанц знайсці сваё месца на старонках выдання.

Разам з Уладзімірам Мазго, намеснікам рэдактара часопіса «Нёман», Рагнед Малахоўскі прыняў удзел у семінары дырэктараў бібліятэчных сетак вобласці, які праходзіў на базе Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. Леніна. Прадстаўнікоў абодвух часопісаў сустрэлі, як добрых знаёмых, чыя творчасць на Магілёўшчыне вядома і запатрабавана. Пісьменнікі нагадалі пра тое, наколькі цесна выданні супрацоўнічаюць з пачынаючымі літаратарамі і музыкантамі, а таксама зачыталі некалькі кранальных вершаў са сваіх зборнікаў.

Як адзначыла намеснік дырэктара Магілёўскай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса Вольга Волкава, часопісы Выдавецкага дома «Звязда» карыстаюцца сярод чытачоў вялікім попытам. А на «Полымя» і «Маладосць», якія можна ўзяць на абанеменце, нават існуе чарга.

— Цікавасць да сучаснай беларускай літаратуры павялічваецца, — паведаміла Вольга Уладзіміраўна. — Прычым не толькі сярод мэтанакіраванай аўдыторыі, якая сочыць за літаратурнымі тэндэнцыямі з прычыны сваіх прафесійных абавязкаў. Дарэчы, калі мы некалькі год таму праводзілі літаратурны конкурс, у намінацыі «За чытанне беларускай літаратуры» перамог менавіта чытач «Полымя».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Рэверс з сайта «Звязды» www.zviazda.by

Шануйце настаўніка і дайце яму спакойна працаваць

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Апошнім часам шмат разважаюць пра неабходнасць дэбюракратызацыі школы, пра тое, што педагогамі камандуюць усе запар. Зараз рыхтуюцца карэкціроўкі ў Кодэкс аб адукацыі, і многія спадзяюцца, што змены будуць да лепшага. Чытачы «Звязды» таксама не застаюцца ў баку ад абмеркавання праблем школы...

«ПАРАДОКСЫ І СІТУАЦЫІ» (27.03.2015)

Суправаджэнне правозу дзяцей у школу аплачваецца з прэміяльных грошай як пашырэнне службовых абавязкаў, па ўзгадненні з прафсаюзнай арганізацыяй школы. У школах з камплектам навучэнцаў 150 чалавек на такія выплаты выдаткоўваецца прыкладна 3 000 000 рублёў з прэміяльнага фонду настаўнікаў. Гэтыя грошы ідуць на аплату працы настаўніка, які суправаджае вучняў на канферэнцыі, у завочныя школы, працу са школьным сайтам і г.д.

«Каб набраць профільны клас, дзяцей яшчэ трэба падцягнуць да таго ўзроўню, каб яны маглі вывучаць прадмет паглыблена. Які сэнс, што ў нас адкрылі профільныя класы, а вучні не могуць засвоіць іх праграму?»

А вось гадзіны вучэбна-выхаваўчай работы і факультатыўных заняткаў патрабуюць дадатковых тлумачэнняў пра ўмовы іх размеркавання, бо гэта выклікае шмат спрэчных пытанняў у школах. Напрыклад, як можна растлумачыць 4 гадзіны ў тыдзень класнага кіраўніцтва ў класе з 7 навучэнцамі? Або 2 гадзіны факультатыўных заняткаў па матэматыцы ў класах з узроўнем ведаў вучняў, не вышэйшым за другі?

Канстанцін.

«АДЗНАКА Ў ШКОЛЕ: ПЕРНІК ЦІ БІЗУН?» (21.03.2015)

Я займаўся безадзнакавым навучаннем на працягу пяці гадоў. Распрацаваў методыку арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці на ўроках выяўленчага мастацтва і працоўнага навучання, якая змяншае колькасць папер і дае добры вынік у фарміраванні адэкватнай самаацэнкі вучняў. Насамрэч, праблема безадзнакавага навучання не ў паперах, а ў галавах дарослых. Стэрэатып «адзнакі», як «халера», перакідваецца з галоў дарослых у галовы дзяцей. Святлана Гін правяла вельмі цікавае даследаванне. Аказваецца, вучні атрымліваюць адзнакі для бацькоў! Ёсць пра што задумацца... І не трэба тады шукаць адказ на пытанне, чаму дзеці не хочуць хадзіць у школу... Калі яны ў пачатковай школе на асэнсаваным узроўні не навучацца атрымліваць веды і не адчуюць асалоду ад паспяховай дзейнасці (а пры безадзнакавым навучанні гэта адна з асноўных ідэй), то ў старшых класах ні бізун, ні пернік, ні аўтарытэт бацькоў не змогуць прымусіць іх вучыцца. Практыка паказвае, што адзнакі патрэбны не столькі дзецям, колькі дарослым. Калі ў класе на ўроках цікава, то вучні і не ўспамінаюць пра адзнаку, асабліва на ўроках малявання і працы.

Міхаіл.

Безадзнакавая сістэма ў пачатковай школе дае магчымасць адаптацыі дзецям, якія ідуць у школу, чакаючы чагосьці новага, без «ярлыкоў» выдатнікаў і двоечнікаў. Настаўніку такая сістэма дае магчымасць разгледзець здольнасці навучэнца, адкарэктаваць яго паводзіны. Вельмі добрая, на мой бацькоўскі погляд, сістэма.

Ірына.

«ВЫРАСЦІЦЬ І ВЫХАВАЦЬ ПЕДАГОГА» (04.03.2015)

Профільныя педагагічныя класы — гэта добра, але педагагічныя ВНУ яшчэ доўга будуць напаўняцца па рэшткавым прынцыпе, пакуль дзяржава не вырашыць пытанне з заробкамі. Яго і зараз можна вырашыць, прыбраўшы з адукацыі лішнія структуры і расставіўшы прыярытэты правільна: на першае месца паставіць заробкі педагогаў, а не дарагія і бессэнсоўныя закупкі абсталявання для школ.

Можна было б павысіць зарплату за кошт арганізацыі платных паслуг пры школе, але не так, як гэта робіцца цяпер, калі бацькі за курсы пералічваюць школе 15 000 000 рублёў, а настаўнікі з гэтай сумы атрымліваюць 2 800 000. Можна зразумець, калі ў дзяржавы няма сродкаў на тое, каб павысіць заробкі настаўніку. Але як зразумець, калі настаўнік арганізуе платныя паслугі пры школе, але атрымлівае за сваю працу «капейкі»? Калі мы хочам, каб маладыя спецыялісты затрымліваліся ў школах, трэба ствараць для іх усе ўмовы, каб яны маглі зарабляць сваім талентам і сваёй галавой. Не падумайце, што на платных курсах практыкуецца «абдзіралаўка» бацькоў. Бацькі ў тыдзень плацяць толькі да 20 000 рублёў — і гэтыя грошы не супастаўныя з тымі, якія яны аддаюць рэпетытарам! А плата за некаторыя курсы, без выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі, наогул не выходзіць за 10 000 рублёў у тыдзень.

Цяпер усе кінуліся абмяркоўваць «якасць» падручнікаў. Мы зноў гатовы «ўбухаць» велізарныя грошы ў сумніўную авантуру. Падручнікі нельга мяняць так часта: больш выгадна іх перавыдаваць. Калі толкам разабрацца, то прычына нізкай паспяховасці па многіх прадметах хаваецца не ў саміх падручніках, а ў часе, які павінен адводзіцца на вывучэнне гэтых прадметаў. У 6-м класе на вывучэнне матэматыкі даецца 5 гадзін у тыдзень, а ў 7-м класе, дзе з'яўляецца геаметрыя, — 4 гадзіны ў тыдзень! Раней на вывучэнне курса матэматыкі адводзілася 6 гадзін у тыдзень, а ў некаторых класах на вывучэнне алгебры і геаметрыі ў другім паўгоддзі было 7 гадзін! Рэзкае скарачэнне колькасці гадзін прывяло да таго, што колькасць матэрыялу, які вучні павінны засвоіць на ўроку, узрасла на траціну. Цяпер многія тэмы школьнікам даводзіцца вывучаць самастойна, а калі яшчэ і ўрокі прапускаюцца па якіх-небудзь прычынах, то працэс вывучэння прадмета заканчваецца на паняційным узроўні. Як можна марыць пра замацаванне ведаў? Паспець бы проста прайсці праграму!

«Як хочацца, убачыўшы, што пад'язджае аўтобус з праверкай, не трэсціся ад страху, а радасна сказаць: «Ура, прыехалі метадысты і спецыялісты, якія дапамогуць вырашыць маю праблему хутка і якасна».

Між іншым, вучняў зрываюць з заняткаў па любых прычынах. У сярэднім за год яны прапускаюць каля месяца паўнавартасных заняткаў, і ніхто за гэта адказнасці не нясе. Бяда яшчэ і ў наступным: рэформай сярэдняй адукацыі займаюцца і тыя, хто ў школе нават дня не працаваў. Размовы зараз вядуцца толькі пра падрыхтоўку ў ВНУ, ЦТ і пра профільныя класы. Выбачайце, але каб набраць профільны клас, дзяцей яшчэ трэба падцягнуць да таго ўзроўню, каб яны маглі вывучаць прадмет паглыблена. Які сэнс, што ў нас адкрылі профільныя класы, а вучні не могуць засвоіць іх праграму? Гэта прынцып даміно: у нас здаюць ЦТ і ідуць у ВНУ, але не гатовы вучыцца па праграме ВНУ.

«Навошта ў школе тры ўрокі фізічнай культуры!» — абуралася мая маці, якая, заўважу, выкладала каля 40 гадоў гэты прадмет у школе. Насамрэч, ці патрэбны тры ўрокі фізічнай культуры ў школе? А ці патрэбны ўрокі па асновах бяспекі жыццядзейнасці? Няўжо стала менш няшчасных выпадкаў з дзецьмі? Раней гэтыя тэмы разглядаліся адзін раз у месяц на класных гадзінах 10-15 хвілін і 20-30 хвілін адводзілася ім на класных гадзінах перад канікуламі. Цяпер жа гэта асобны прадмет у школе, які затрымлівае нашых дзяцей яшчэ на адну гадзіну. А, магчыма, гэтую гадзіну лепш выдаткаваць на фізіку або матэматыку? Каб у настаўніка было больш часу для тлумачэння тэмы, затое дома вучням бы не прыйшлося самастойна вывучаць тое, што не паспелі зрабіць разам з настаўнікам на ўроку... У савецкія часы, калі ў школе было 6-7 гадзін матэматыкі і 3-4 гадзіны фізікі на тыдзень, я наогул вельмі рэдка задаваў хатняе заданне, ведаючы, што калі я вучня не навучыў на ўроку, то карысці ад хатняга задання ўсё роўна не будзе. Але тады я мог сабе гэта дазволіць, а цяпер — толькі спачуваю вучням.

Анатоль САФОНАЎ.

«ДВАЦЦАЦЬ ДАКУМЕНТАЎ ЗАМЕСТ ПЯЦІ ДАВОДЗІЦЦА ЗАПАЎНЯЦЬ ПЕДАГОГАМ» (12.02.2015)

Мне здаецца, што гэтая праблема ніколі не вырашыцца. Кожны дзень аддзелы адукацыі, спорту і турызму шлюць новыя планы, патрабуюць новыя справаздачы. Кожны правяраючы, калі чытае той ці іншы школьны дакумент, хоча падладзіць яго пад сябе, пад сваё бачанне. Ніхто не бярэ пад увагу перамогі вучняў у конкурсах, спаборніцтвах на абласным і рэспубліканскім узроўнях: галоўнае — каб справаздачы былі напісаны так, як хоча спецыяліст з аддзела адукацыі.

Праз паперы, праз мноства конкурсаў мы не бачым дзяцей. Душа і сэрца ўжо крычаць: «Дайце спакойна працаваць! Шануйце настаўніка! Паважайце яго працу!» Мы працуем без выхадных, часам без абеду! Не пералічвайце вучняў у шосты школьны дзень. Няхай кожная сям'я выбірае, што для дзіцяці больш важна. Каб настаўнік не баяўся таго, што ў суботу прыедзе праверка і калі колькасць навучэнцаў будзе нізкай, то яго школа будзе «гучаць» у даведцы кантролю на ўвесь раён. Як хочацца, убачыўшы, што пад'язджае аўтобус з праверкай, не трэсціся ад страху, а радасна сказаць: «Ура, прыехалі метадысты і спецыялісты, якія дапамогуць вырашыць маю праблему хутка і якасна».

«Безадзнакавая сістэма ў пачатковай школе дае магчымасць адаптацыі дзецям, якія ідуць у школу, чакаючы чагосьці новага, без «ярлыкоў» выдатнікаў і двоечнікаў».

Школа — гэта дзеці. Яны патрабуюць увагі і павагі. А мы ў мітусні справаздач, праверак, розных нарад, пасяджэнняў забываемся пра нашу галоўную задачу. Спецыялісты аддзелаў адукацыі працуюць з паперамі, і кожны з іх курыруе свой напрамак, а намеснік дырэктара па выхаваўчай працы павінен ахапіць усё і паказаць кожнаму спецыялісту глыбокую, змястоўную працу па кожным з іх: а гэта 11 кірункаў Канцэпцыі бесперапыннага выхавання навучэнцаў і моладзі плюс гандаль людзьмі, карупцыя і іншыя. Працуючы ў школе больш як 20 гадоў, бачу, што ад гэтых папер, планаў, справаздач, даведак нашы дзеці не сталі лепшымі. Мы жывыя людзі, якія павінны не страчваць на працы сваё здароўе, а атрымліваць ад яе радасць і задавальненне, адчуваць падтрымку не толькі з боку вучняў (хоць гэта — самае галоўнае), але і з боку спецыялістаў, метадыстаў, кіраўнікоў усіх структур...

Тамара

■ Прызнанне

Нобелеўская прэмія для педагогаў

На Глабальным форуме па пытаннях адукацыі і павышэння кваліфікацыі ў Дубаі (Global Education and Skills Forum) прайшла першая цырымонія ўзнагароджвання найлепшых настаўнікаў свету. Настаўніцу англійскай мовы з амерыканскага штата Мэн Нэнсі Этвел аб'явілі галоўнай пераможцай.

Нэнсі мае саракагадовы педагагічны стаж і з'яўляецца аўтаркай шэрагу кніг па методыцы выкладання, адна з якіх выйшла накладам у паўмільёна асобнікаў.

Нэнсі Этвел стала піянерам сярод настаўнікаў Амерыкі, прапанаваўшы выкладаць літаратуру ў форме воркшопаў (англ. «майстэрня; семінар, майстар-клас») па чытанні і пісьму. Яе васьмікласнікі штогод прачытваюць каля сарака кніг, што нашмат больш, чым сярэдні паказчык па краіне (ад 6 да 10). Каб распаўсюджваць свае інавацыйныя метады навучання, у 1990 годзе Нэнсі заснавала Цэнтр навучання і выкладання з выдатнай бібліятэкай. У дадатак да ганаровага звання Нэнсі Этвел атрымала 1 мільён долараў. Ужо вядома, што гэтыя грошы педагог укладзе ў развіццё свайго цэнтра.

На галоўны прыз спачатку прэтэндавалі 5 тысяч лепшых педагогаў з розных краін, у паўфінал выйшлі 50, а ў фінале былі прадстаўлены дзесяць найлепшых.

Напрыклад, у фінал прайшла педагог з Камбоджы Фала Неанг. З 1986 года Фала пачала працаваць са сляпымі дзецьмі — у тыя часы яна была дырэктарам школы ў лагеры для бежанцаў. У Камбоджы было прынята лічыць, што сляпыя людзі не здольныя вучыцца, паколькі зграшылі ў мінулым жыцці і таму заслугоўваюць адзіноту. Фала прымусіла грамадства думаць па-іншаму. У сваёй працы яна робіць вялікі акцэнт на гукі і рухі: вучні шмат танцуюць і слухаюць музыку.

Стывен Рытц з ЗША робіць акцэнт на экалагічных магчымасцях школ. Яго вучні стварылі больш за сто садоў, забяспечыўшы школы ежай. На думку выкладчыка, такая мадэль устойлівага развіцця школы можа быць паўторана дзе заўгодна. Цяпер школы, з якімі працуе Стывен, існуюць, абапіраючыся толькі на свае рэсурсы, а іх вучні вырастаюць сацыяльна адказнымі грамадзянамі.

Прэмія, сродкі на якую выдаткоўвае дабрачынны фонд Varkey Gems, была заснавана, каб падкрэсліць значэнне прафесіі педагога і павысіць прэстыж прафесіі настаўніка ў грамадстве. Яе ўжо паспелі ахрысціць «Нобелеўскай прэміяй для настаўнікаў».

Надзея НІКАЛАЕВА

«НАША МЭТА — ТОП-50»

Сяргей Румас, які пераабраны на пасаду старшыні Беларускай федэрацыі футбола, паабяцаў вывесці гульню №1 на перадавыя пазіцыі

Такім чынам, старшыня праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь Сяргей Румас пераабраны на пасаду старшыні асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» на другі чатырохгадовы тэрмін. За яго кандыдатуру аднагалосна прагаласавалі ўдзельнікі справаздачна-выбарчай канферэнцыі АБФФ.

Першым намеснікам старшыні абраны Сяргей Сафар'ян, намеснікамі — Сяргей Куніца і Юрый Курбыка.

Акрамя гэтага, удзельнікі канферэнцыі абмеркавалі справаздачу выканкама АБФФ аб праведзенай рабоце і ацанілі яе як здавальняючую.

— За чатыры гады была праведзена вялікая праца па ўдасканаленні футбола ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай. Наколькі ўдалося дамагчыся мэтаў? Любое развіццё патрабуе фінансавых укладанняў. Выканкамам было прынята рашэнне аб істотным павелічэнні матэрыяльнай дапамогі, прадастаўляемай рэгіянальным федэрацыям. Дзякуючы гэтым намаганням, колькасць аматарскіх каманд за апошнія гады ўзрасла з 178 да 192. Як адзначыў Сяргей Румас агульная колькасць беларусаў, якія займаюцца футболам, за чатыры апошнія гады павялічылася ўдвая — да 300 тысяч чалавек.

Старшыня асацыяцыі звярнуў увагу на адну з галоўных праблем беларускага футбола — цікавасць гледачоў і наведвальнасць нацыянальнага чэмпіянату.

— Галоўны паказчык папулярнасці нацыянальнага чэмпіянату — колькасць заўзятараў, — лічыць Сяргей Румас. — Вымушаны канстатаваць: гэта — адна з галоўных праблем. А прычына — апатыя большасці клубаў, якія нічога не робяць для прыцягнення заўзятараў. З 2011 года толькі тры каманды апекавалі стварэнне іх клубаў. Паважаныя кіраўнікі, даўно пара зразумець: гара не ідзе да Магамеда. Вам трэба зрабіць канкрэтныя крокі, каб павярнуць футбол да народа!

Прыярытэтнымі задачамі кіраўніцтва АБФФ на найбліжэйшую будучыню стане развіццё дзіцяча-юнацкага футбола з прыцягненнем да заняткаў не толькі хлопчыкаў, але і дзяўчынак. На думку Сяргея Румаса, адным з важных фактараў папулярызацыі «гульні нумар адзін» сярод прадстаўніц прыгожага полу будзе правядзенне ў Беларусі фінальнага этапу чэмпіянату Еўропы — 2016 сярод дзяўчат да 17 гадоў.

Што тычыцца нацыянальнай зборнай, то ў наступныя 4 гады яна павінна істотна ўмацаваць свае пазіцыі ў рэйтынгу ФІФА і ўвайсці ў лік 50 найлепшых зборных планеты. Нагадаем: цяпер Беларусь займае 98-е месца.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Прызёр Алімпійскіх гульняў Ксенія САНКОВІЧ і першы віцэ-прэзідэнт НАКа Максім РЫЖАНКОЎ.

АЛІМПІЙСКІ ЛЕС

Лепшыя спартсмены прынялі ўдзел у акцыі «Тыдзень лесу — 2015»

З 28 сакавіка па 4 красавіка па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі ў Беларусі праходзіць акцыя «Тыдзень лесу — 2015». Лесаводы краіны прысвячаюць яе 70-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Удзельнікі акцыі высаджваюць дрэвы ў гонар воінаў-вызваліцеляў, дзякуючы подзвігу якіх Беларусь вось ужо 70 гадоў з'яўляецца мірнай краінай.

Напярэдадні дрэвы пасадзілі і беларускія спартсмены на чале з **першым віцэ-прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Максімам Рыжанковым і генеральным сакратаром Анатолем КОТАВЫМ.** Сярод спартсменаў, якія прынялі ўдзел у акцыі, — чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў Эліна Зверава, Дзмітрый Дашчынскі, Ксенія Санковіч, Святлана Парамыгіна, Любоў Чаркашына, Сяргей Макаранка, Таццяна Лядоўская, а таксама заслужаныя трэнеры Мікалай Казека і Васіль Князеў.

Алімпійскія елкі пад кіраўніцтвам галоўнага ляснічага Мінскага лясгаса Аляксандра Мірановіча высадзілі каля пасёлка Станкава. Як расказаў спецыяліст, ужо гады праз 4 тут можна будзе ўбачыць сапраўдны лес, а праз 7 гадоў вышыня дрэў дасягне 10 метраў.

Летась, дарэчы, Тыдзень лесу сабраў у краіне больш за 50 тысяч удзельнікаў. З іх дапамогай было пасаджана больш за 70 мільёнаў дрэў. Таксама ўдзельнікі акцыі закладвалі памятныя алеі і скверы ў гонар воінаў Вялікай Айчыннай вайны, якія змагаліся за вызваленне Беларусі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Фота Надзеі БУЖАН.

Настаўнік і вучань: Мікалай КАЗЕКА і Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ.

ГЛОБУС — БЕЛАРУСІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напярэдадні, 31 сакавіка, беларускія біятланісткі не прыбылі ў Мінск рэйсам з Аўстрыі. Спартсменкі дабіраліся да Вены ўнутраным рэйсам з Зальцбурга, які быў затрыманы. У сувязі з гэтым беларускі спазніліся на рэйс у Мінск. Але ўжо ўчора каманда вярнулася на радзіму.

Сустрэлі дзяўчат шматлікія заўзятары, журналісты, кіраўнікі спартыўных структур і, безумоўна, родныя і сябры. Прыхільнікі таленту Дар'і Домрачавай падаравалі спартсменцы торт і яе партрэт. Сама Даша, як заўсёды з выдатным настроем, падзялілася з журналістамі ўражаннямі аб нядаўнім трыумфе і расказала, якія перамогі былі самыя складаныя і ад таго — самыя каштоўныя.

— Алімпійскія гульні ўсё ж не праводзяцца кожны год. У лютым 2014-га вельмі важна было сканцэнтравацца на адным тыдні, на канкрэтным турніры, трэба было паказаць усё, што назапасіла і напрацавала за гэтыя гады. За Вялікі хрустальны глобус можна пазмагацца ў кожным сезоне, а за золата Алімпіяды — не. Такая ўвага да барацьбы ў агульным заліку Кубка свету ў гэтым сезоне толькі таму, што доўгія гады мне не скаралася гэтая вяршыня. Вельмі рада, што змагла дамагчыся гэтага выніку, — распавяла спартсменка.

Адносна перспектыў на наступны сезон Дар'я адказала ў фармаце першакрасавіцкага жарту: усёй камандай адпачнём і будзем рыхтавацца да летніх Гульняў у Рыа-дэ-Жанейра, дзе плануем выступіць у сінхронным плаванні.

Дар'я Домрачава па выніках сезона 2014/15 стала пераможцай агульнага заліку розыгрышу Кубка свету, набраўшы 1092 ачкі. Вялікі хрустальны глобус, які ўручаецца трыумфатару сезона, — першы ў кар'еры Домрачавай. Менавіта гэтай узнагароды да нядаўняга часу не хапала ў яе багатай калекцыі трафеяў сусветнага біятлона.

На этапах Кубка свету ў гэтым сезоне Дар'я дзевяць разоў падымалася на самую высокую прыступку п'едэстала. Найбольшая колькасць перамог у яе ў гонках праследавання — чатыры, двойчы Домрачава выйгравала спрынтарскія гонкі і двойчы станавілася першай у гонках з масавага старту. Беларуска таксама перамагла на першым этапе Кубка свету ў шведскім Эстэрсундзе ў індывідуальнай гонцы.

Вялікі хрустальны глобус — галоўная ўзнагарода Міжнароднага саюза біятланістаў. Уручаецца спартсмену і спартсменцы, якія на працягу сезона набіраюць найбольшую колькасць ачкоў у гонках Кубка свету. Мужчыны разыгрываюць трафей з 1978 года, жанчыны — з 1987-га. Больш за іншых (па 6 разоў) Кубак свету выйгравалі нарвежац Уле Эйнар Б'ёрндален і шведка Магдалена Форсберг.

Дар'я Домрачава — другая беларуская біятланістка, якая заваявала Вялікі хрустальны глобус. Упершыню трафей скарыўся Святлане Парамыгінай — гэта было 20 гадоў таму. У Дар'і Домрачавай цяпер ёсць усе ўзнагароды, якія разыгрываюць у біятлоне.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

І астатніх нашых мілых дзяўчат — Надзею СКАРДЗІНУ, Ірыну КРЫЎКО, Настассю ДУБАРЭЗАВУ і Надзею ПІСАРАВУ — беларускія аматары біятлона імгненна акружылі і не адпускалі без кветак і сэлфі.





Фота БЕЛТА.

«ДАКАР» НА АЙЧЫННЫ ЛАД

Колішні палігон Дрэтунь на Полаччыне прыме беларуска-расійскае аўтаралі

Заліхвацкія віражы, роў магутных матораў, экстрэмальная хуткасць, захапляльныя кадры з кабіны пілота... Ралі пануе на спартыўных тэлеканалах у цёплы час года. У жыхароў Беларусі сёлета зноў з'явіцца магчымасць паназіраць за аўтамабільным спортам у межах краіны.

— Год таму прапанова аб правядзенні спаборніцтваў «Баха Беларусь» паступіла да нас за два з паловай месяцы да іх пачатку, — згадвае намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Цярэнцьеў. — Яна здавалася крыху авантурнай, але ўсё-такі вырашылі ад такой магчымасці не адмаўляцца. І эфект ад аўтагонак пераўзышоў усе нашы чаканні. Гледачы тады з'ехаліся з усёй Беларусі. Сёлета ж траса гонак будзе больш складанай і даўжэйшай. Пройдзе яна па лясных, няходжаных месцах, якія мусяць быць прывабнымі для гоншчыкаў.

Аўтамабілі павышанай праходнасці — грузавікі і пазадарожнікі — выйдуць з 29 па 31 мая на трасы былога воінскага палігона Дрэтунь у Полацкім раёне. Зрэшты, пад звыклае паняцце трасы дыстанцыя спаборніцтваў «Баха Беларусь» даўжынёй у 220 кіламетраў, якая складаецца з двух кругоў, зусім не падпадае.

— Пясок, грунт, гравійныя дарогі, разбітыя ад часу асфальтавыя ўчасткі, брады, масты — мы імкнуліся дасягнуць максімальнай разнастайнасці пакрыцця трасы, — расказвае **старшыня Камітэта пазадарожных спаборніцтваў Беларускай Аўтамабільнай Федэрацыі Алег МІКАЛАЕЎ.** — Аднак на гэтым падрыхтоўка не заканчваецца. Перад намі стаяла задача знайсці велізарнае маланаселенае месца, пажадана з абсалютнай адсутнасцю інфраструктуры і мінімальнай колькасцю мясцовага насельніцтва. Самі разумееце, дадатковыя праблемы і прыгоды нікому не патрэбны. Адна з заган нашых трас — іх вузкасць. На лясных дарогах два грузавікі амаль не могуць раз'ехацца. Мы гэта прадугледзелі. Усе машыны будуць абсталяваны спецыяльнымі электроннымі прыборамі. Калі адзін экіпаж дагоніць іншы, ён падасць сігнал па радыёканале, і той, хто едзе наперадзе, будзе абавязаны яго прапусціць.

Сёлета 1-ы этап чэмпіянату Беларусі па ралі-рэйдзе і 3-ці этап аналагічнага чэмпіянату Расіі будуць сумешчаны і прымеркаваны да 70-годдзя Перамогі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

БЕЛАРУСБАНК

**Публичная оферта (предложение)
о начислении поощрительного процентного дохода
по срочным банковским вкладам в белорусских рублях
«Интернет-депозит»,
«Интернет-депозит-Презент»,
«Интернет-депозит-Тренд»**

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает начисление поощрительного процентного дохода по следующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях в период **с 31.03.2015 по 27.04.2015 (включительно):**

- **«Интернет-депозит»** – в размере **9%** годовых;
- **«Интернет-депозит-Презент»** – в размере **10,5%** годовых;
- **«Интернет-депозит-Тренд»,** (вне зависимости от срока и ежедневного остатка вклада) – в размере **8%** годовых.

Начисление и выплата поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 31.03.2015 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 27.04.2015 (включительно) в порядке, установленном соответствующим договором банковского вклада (депозита) для начисления и выплаты основных процентов.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного процентного дохода.

**Подробности по телефону 147,
на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

ОТЧЕТ ПО ИСПОЛЬЗОВАНИЮ ФОНДОМ СВОЕГО ИМУЩЕСТВА

Во исполнение Указа Президента Республики Беларусь от 1 июля 2005 г. № 302 «О некоторых мерах по упорядочению деятельности фондов» сообщаем следующие сведения:

Информация о количестве учредителей фонда:

Состав учредителей Благотворительного фонда «Искренность» не менялся.

1. Коваленко Игорь Николаевич (учредитель фонда)
2. Горбачев Виктор Борисович (учредитель фонда)

Место нахождения руководящего органа (юридический адрес) Благотворительного фонда «Искренность»: город Могилев, улица Ленинская, д. 29, ком. 301.

Информация о стоимости имущества фонда, в том числе:

Имущество Фонда сформировано учредителями в размере 3500000 (Три миллиона пятьсот тысяч) белорусских рублей за счет денежных и не денежных взносов учредителей.

Имуществе, переданном учредителями (учредителем) фонда:

В качестве взноса в уставной капитал, внесен ноутбук стоимостью 2000000 (Два миллиона рублей) и денежный взнос в сумме 1560000 (Один миллион пятьсот шестьдесят тысяч рублей).

УНП 790677641

Утерянные свидетельство о государственной регистрации и устав Общества с ограниченной ответственностью «Фемида-Консалт», УНП 191310317 **считать недействительными.**

ЕВАНГЕЛЛЕ І АБРАЗ ЗА МАТРАЦАМІ

Гомельская мытня канфіскавала культурныя каштоўнасці XX стагоддзя.

Мытнікі разам з пагранічнікамі ў рэспубліканскім пункце мытнага афармлення праводзілі мытны кантроль пасажырскага цягніка Санкт-Пецярбург — Кішынёў. У адным з купэ была знойдзена кніга "Новы запавет госпада нашага Ісуса Хрыста" на царкоўнаславянскай і рускай мовах 1902 года выдання і абраз, выкананы на дошцы, паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Каштоўнасці былі схаваны за згорнутымі матрацамі. Апытанне службовых асоб цягніковай брыгады і пасажыраў плёну не далі: уладальніка каштоўнасцяў устанавіць не атрымалася. Яны канфіскаваныя, прызначана мастацтвазнаўчая экспертыза. Па выніках праверкі матэрыялы будуць накіраваны ў суд з мэтай вяртання маёмасці ў даход дзяржавы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Об уменьшении Уставного фонда ОАО «Витебский мясокомбинат»

Открытое акционерное общество «Витебский мясокомбинат», (ОАО «Витебский мясокомбинат», 210604, г. Витебск, Бешенковичское шоссе, 46, тел. 268180, факс 268428) уведомляет о том, что 25 марта 2015 г. очередным общим собранием акционеров ОАО «Витебский мясокомбинат (протокол № 58 от 25 марта 2015 г.) принято решение об уменьшении уставного фонда. Уставный фонд ОАО «Витебский мясокомбинат», составляющий 301 109 491 800 белорусских рублей, уменьшается на 4 526 100 белорусских рублей (стоимость выкупленных акций по требованию акционеров, в связи с совершением крупной сделки Общества). Новый уставный фонд ОАО «Витебский мясокомбинат» составит 301 104 965 700 белорусских рублей.

УНП 300082579

УП «Институт «Белпромстройпроект»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

**по выбору субподрядной организации для выполнения раздела «Оценка воздействия на окружающую среду»
по объекту «Строительство завода для производства специальных сталей объемом производства 300 000 тонн в год»
обоснование инвестиций.**

Срок представления предложений – 09.04.2015 г.
Фондеранцева Наталья Семеновна, тел. 8 017 200 28 30.

УНП 100049147

Считать утерянными бланки строгой отчетности ЗАСО «Промтрансинвест»: квитанции 1-СУ серии КС № 4121347, № 3605207, № 4133340, № 4112174, универсальные полисы серии ПЕ № 0069861, № 0082201, № 0100398, № 0082918, полисы по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу серии БА № 0631537, № 0631558, № 0631559, № 0781619, № 0627698, № 0611385, № 0611386, № 0530395, полисы по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 3180581, № 3180582, № 2869283, полис по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств – членов системы «Зеленая карта» серии BY07/09605783.

УНП 100357923

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.
Продавец	**ОАО «Витебский хладокомбинат»,** г. Минск, ул. Полярная, 8.

Предмет аукциона

Здание административно-хозяйственное, инвентарный номер 200/С-46403, общей площадью **645,2** кв.м, расположенное по адресу: **Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43.**
Составные части и принадлежности: пристройка, пристройка, ступеньки, крыльцо, проезжая часть (покрытие – асфальтобетон, участок 1 пл. – 1525,7 кв.м, участок 2 пл. – 236,9 кв.м), пешеходная часть (116,7 кв.м, покрытие – асфальтобетон) ограждение (уч. 1, 2, 3, 4, 5), ворота). Обременения: частичная аренда.

Гараж-склад, инвентарный номер 200/С-51544, общей площадью 66 кв.м., расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43/1.

Водомерный узел, инвентарный номер 200/С-51546, общей площадью 12 кв.м, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 43А/11.
Составные части и принадлежности: проезжая часть (участок 1 – покрытие – асфальтобетон, пл. 64,4 кв.м; участок 2 – покрытие – асфальтобетон, пл. 245,4 кв.м), ограждение, ворота).

Водопроводная сеть, инвентарный номер 200/С-87067 (протяженность – 107,1 м, способ прокладки – подземный траншейный).

Хозбытовая канализационная сеть, инвентарный номер 200/С-87069 (протяженность – 55,7 кв.м, способ прокладки – подземный траншейный).

Сведения о земельных участках: для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений продавцу на праве постоянного пользования предоставлены два земельных участка:

Кадастровый номер: 240100000003001750. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 43. Площадь (га): 0,4515. Данный земельный участок является неделимым. По участку проходит часть тепловой сети, не входящей в состав имущества, подлежащего продаже. При реализации недвижимого имущества земельный участок будет предоставлен в общую долевую аренду.

Кадастровый номер: 240100000003007468. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43А/ 11. Площадь (га): 0,0417.

Начальная цена с НДС 20% – 4 795 200 000 бел. руб.

Предмет аукциона обременен договорами аренды.

Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты: если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуты договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **05.05.2015** в 14.00 по адресу: г. Витебск, ул. Полярная, 8 ОАО «Витебский хладокомбинат».

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.04.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

Утерянные бланки квитанций 1-СУ серии КС №№ 8842452, 8842453, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительными.**

УНП 101063229

РУП «Жилкоммунтехника» (организатор аукциона)

Извещает о проведении аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества
Сведения о балансодержателе: РУП «Жилкоммунтехника», г. Минск, ул. Кальварийская, 25, тел. 8 (017) 204 71 51

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Размер арендной платы в месяц с НДС 20%
Помещение на 1-м этаже в капитальном строении (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (Литер А 2/к) с инв. №500/С-8445), отапливаемое Коэффициент спроса – 1,6; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0.					
1	Помещение 371,0 м.кв.	г. Минск, ул. Чапаева, 4	8 829 800	882 980	35 319 200
Помещения на 1-м этаже в капитальном строении (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (Литер А 2/к) с инв. №500/С-8445), отапливаемое Коэффициент спроса – 2,0; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0.					
2	Помещение 34,3 м.кв.	г. Минск, ул. Чапаева, 4	1 020 425	102 043	4 081 700
3	Помещения №3 – 112,7 м.кв., №4 – 18,2 м.кв., №5 – 67 м.кв., №6 – 9,5 м.кв. Общий метраж 207,4 м.кв.		4 936 120	493 612	19 744 480
Помещение на 2-м этаже в капитальном строении (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (Литер А 2/к) с инв. №500/С-8445), отапливаемое Коэффициент спроса – 1,6; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0.					
4	Помещение 463,1 м.кв.	г. Минск, ул. Чапаева, 4	11 021 780	1 102 178	44 087 120
Помещения на 2-м этаже в капитальном строении (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (Литер А 2/к) с инв. №500/С-8445), отапливаемое Коэффициент спроса – 2,1; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0.					
5	Помещение 17,3 м.кв.	г. Минск, ул. Чапаева, 4	772 013	77 201	3 088 050
6	Помещения №17 – 16,1 м.кв., №18 – 18,6 м.кв. Общая площадь 34,7 м.кв.		1 548 488	154 849	6 193 950
7	Помещение 19,2 кв.м.		599 760	59 976	2 399 040
8	Помещения №21 – 20,7 м.кв., №22 – 25,7 м.кв. Общая площадь 46,4 м.кв.		2 070 600	207 060	8 282 400
Капитальное строение с инв. №500/С-23649 «Здание специализированное автомобильного транспорта» – Гараж (Литер Г 1/м), не отапливаемое. Коэффициент спроса – 1,0; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0.					
9	Гараж 109,9 м.кв.	г. Минск, ул. Чапаева, 4	1 634 763	163 476	6 539 050

Срок подачи заявления	**По 29 апреля 2015 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25
Дата, время, место проведения аукциона	**02 мая 2015 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209 РУП «Жилкоммунтехника»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012001673822 в ЦБУ №538 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, код 739, УНП 100135569, получатель – РУП «Жилкоммунтехника»
Условие пользования	Размещение офисов, организация производства (кроме вредного), оказание услуг, торговля (любая), размещение складских помещений
Условия продажи	Срок аренды – до 5 лет, шаг аукциона 10%. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. №150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона и подписания протокола будут заключены договоры аренды недвижимого имущества.

Условия участия в аукционе:

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона до проведения аукциона, заключить Соглашение.

2. Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность (засвидетельствованная нотариально).

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

В случае если: участник, выигравший торги, отказался или уклонился от подписания протокола и (или) договора, оформленного по результатам аукциона, и (или) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, а также в случае, если единственный участник несостоявшегося аукциона, согласившийся на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – лицо, приравненное к победителю аукциона), отказался (уклонился) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора аренды, а также в случае если участниками аукциона, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, предусмотрено наложение штрафа в размере 100 базовых величин при начальной цене предмета аукциона менее 500 базовых величин.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор аренды в срок не позднее 10 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое право аренды в сроки, определенные в договоре аренды, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору аренды. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением РУП «Жилкоммунтехника» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по тел. 8 (017) 204 71 51, 204 78 81 (тел., факс).

**РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении 15.04.2015 в 11.00 повторного аукциона**

по продаже автомобиля Соболь (ГАЗ 2217),

принадлежащего РУП «Ордена Трудового Красного Знамени «Институт «БЕЛГОСПРОЕКТ».

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.02.2015.

Подробную информацию можно получить на сайте Организатора аукциона **ino.by или по тел. 8 (017) 306-00-57.**

УНП 190055182

Годовой отчет о деятельности Белорусского республиканского литературного фонда в 2014 году

Белорусский республиканский литературный фонд был зарегистрирован Решением Министерства юстиции Республики Беларусь от 13 августа 2009 года №135, в Едином государственном реестре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №194900297.

08 января 2014 года фонд перерегистрировал Устав в Министерстве юстиции Республики Беларусь и активизировал свою деятельность.

Учредителем Белорусского республиканского литературного фонда является:

- Общественное объединение «Союз писателей Беларуси», зарегистрированное Решением Министерства юстиции Республики Беларусь от 09 декабря 2005 года №01328, в Едином государственном реестре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 805000036 по адресу: 220034, г. Минск, ул. Фрунзе, 5, комн. 200.

Изменений в составе учредителя Белорусского республиканского литературного фонда в 2014 году не было.

Местонахождение Белорусского республиканского литературного фонда: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Фрунзе, 5, ком 209.

Изменений в местонахождении Белорусского республиканского литературного фонда в 2014 году не было.

Белорусский республиканский литературный фонд имеет следующие региональные представительства:

- Брестское областное представительство, г. Брест, пр-т Машерова, 75-1-605;
- Витебское областное представительство, г. Витебск, ул. Правды, 18-24;
- Гомельское областное представительство, г. Гомель, ул. Советская, 126-401;
- Гродненское областное представительство, г. Гродно, ул. Советская, 31-39;
- Минское областное представительство, г. Минск, пл. Свободы, 13;
- Могилевское областное представительство, г. Могилев, ул. Первомайская, 89-50;
- Минское городское представительство, г. Минск, ул. Фрунзе, 5-309.

Изменений в численности региональных представительств Белорусского республиканского литературного фонда в 2014 году не происходило.

Сведения об имуществе Белорусского республиканского литературного фонда:

1. Имущество, переданное учредителем на стадии подачи документов при открытии фонда в Министерство юстиции Республики Беларусь относительно государственной регистрации Белорусского республиканского литературного фонда в денежной форме составляло 3 000 000 (три миллиона) белорусских рублей. Пополнение уставного фонда в 2014 году не происходило.

2. Мероприятия, проводимые в соответствии с Уставом Белорусского республиканского литературного фонда в 2014 году, осуществлялись на возмездной и безвозмездной основе.

3. Белорусский республиканский литературный фонд осуществлял предпринимательскую деятельность в 2014 году лишь постольку, поскольку она была необходима для достижения уставных целей (материально поддерживать членов ОО «Союза писателей Беларуси» и их семей путем выдачи денежной помощи, ссуд, творческих командировок, возможную медицинскую помощь, помогает писателям в охране их авторских прав, оказывает помощь начинающим авторам и другие задачи, которые основываются на Уставе Фонда). Выручка по фонду составила в 2014 году 543 366 360 (пятьсот сорок три миллиона триста шестьдесят шесть тысяч триста шестьдесят) белорусских рублей.

4. Иных запрещенных законодательством поступлений в 2014 году не было.

5. Расходы, понесенные Белорусским республиканским литературным фондом в 2014 году осуществлялись на достижение целей, указанных в Уставе, выплату заработной платы, регулярное перечисление налогов в соответствии с законодательством.

Белорусский республиканский литературный фонд в 2014 году не создавал унитарные и др. предприятия, хозяйственные общества для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе не участвовал в таких юридических лицах.

Генеральный директор фонда: Н.Ф. Коваль

Главный бухгалтер: Н.И. Миролевич

■ Злачынства і пакаранне

ЦІ БУДУЦЬ АДПРАЎЛЯЦЬ У ЛПП ПЕНСІЯНЕРАЎ?

На базе папраўчай калоніі №22 у Івацэвіцкім раёне прайшла «прамая лінія»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ці будзе абвешчана сёлета амністыя? Якія наступствы меў прыняты ў канцы снежня дэкрэт №6, скіраваны супраць наркатычнай навалы? Ці шмат шанцаў пераводу турэмнай медыцыны пад кіраванне Міністэрства аховы здароўя? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні агучылі кіраўнік Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь Сяргей ДАРОШКА і кіраўнік аддзела па наглядзе за законнасцю выканання крымінальных пакаранняў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь старшы саветнік юстыцыі Юрый ГАРОШКА падчас «прамой лініі», якая была арганізавана пры ўдзеле газеты «СБ. Беларусь сегодня».

ДЛЯ АСУДЖАНЫХ ЗА НАРКОТЫКІ — ДЗВЕ КАЛОНІІ

— Мой сын адбывае пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу ў Гомельскай вобласці. Знаходзіцца там больш за 4 месяцы. Не парушаў правілы ўнутранага распарадку, мае падзякі. Пункт 8 артыкула 47 Крымінальна-выканаўчага кодэкса дазваляе пражываць з сям'ёй асуджанаму, які не дапускае парушэння правіл унутранага распарадку, па пастанове начальніка папраўчай установы ў жылым памяшканні, якое належыць ім па праве ўласнасці ці займаемым па дамове найму. Хацелася б скарыстацца гэтай магчымасцю ў сувязі з тым, што сына ніяк не могуць забяспечыць працай.

Сяргей ДАРОШКА:

— Ваш сын мае такое права, і мы звычайна не перашкаджаем яго рэалізацыі. Разбяромся ў вашай сітуацыі. Што датычыцца працаўладкавання, то гэтая праблема існуе не толькі ў Гомельскай вобласці, але і ва ўсіх абласных цэнтрах, дзе маюцца папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу. З кожным аблвыканкамам мы ўзгаднілі план мерапрыемстваў, скіраваных на тое, каб забяспечыць працай гэтых людзей.

— Марына з горада Мінска вас турбуе. Чула, што ўсіх, хто здзейсніў злачынства ў сферы наркакантролю, будуць накіроўваць пасля прыгавору суда ў асобныя калоніі. Адкуль узялася такая ідэя? Які эфект яна дала? Ці не атрымаем мы непажаданы вынік з прычыны камунікацыі паміж сабой наркаманаў «са стажам»?

«У нашай краіне дзейнічае ўсяго адна дзіцячая калонія. Там змешчаны 177 чалавек».

Сяргей ДАРОШКА:

— Пасля таго, як уступіў у сілу Дэкрэт №6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў», мы вызначылі для названых асоб 2 базавыя ўстановы, у якіх яны могуць адбываць пакаранне.

Адна з іх — ПК-22 у Івацэвіцкім раёне, больш вядомая як «Воўчыя норы». Сюды змяшчаюцца людзі, якія парушылі закон упершыню і асуджаны па артыкуле 328 Крымінальнага кодэкса. Другая калонія знаходзіцца ў Глыбокім. Там адбываюць пакаранне асобы, на сумленні якіх больш цяжкія злачынствы і неаднаразова судзімыя. Сярод іншага, там больш магутная вытворчая база.

Адна з нашых мэт тут — лячэнне спажывальнікаў наркотыкаў ад залежнасці. Да таго ж мы ствараем умовы, каб людзі не толькі адбывалі пакаранне, але і атрымлівалі спецыяльнасць, па якой змогуць працаваць пасля вызвалення. Пройдзе тры, чатыры, дзесяць гадоў — тэрмін скончыўся. Наступае вольнае жыццё. А што далей? Таму асноўная задача папраўчай установы — скарэктаваць паводзіны асуджанага, каб ён уліўся пасля выхаду на волю ў грамадства. Што датычыцца вашай заклапочанасці пра тое, што асуджаныя будуць ствараць нейкія наркасіндыкаты, мы гэтага не дапусцім, бо маем дастатковы вопыт работы з гэтай катэгорыяй людзей.

— Віктар з Мінска на провадзе. Як у сістэме ажыццяўлення пакарання вядзецца статыстыка тых, хто выходзіць на волю, як адсочваецца іх далейшы лёс?

Сяргей ДАРОШКА:

— Сама сістэма адбывання пакарання прадугледжвае рэсацыялізацыю чалавека ў грамадства. Мы ўжываем своеасаблівы сацыяльны ліфт. Гэта паэтапнае зніжэнне жорсткасці рэжыму пакарання. Напрыклад, у папраўчай установе адкрытага тыпу чалавек сам сябе забяспечвае, але застаецца пад наглядам. Пасля выхаду з калоніі мы на працягу года сочым за людзьмі, якія знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі — здзейснілі яны правапарушэнне ці сапраўды сталі на правільны шлях. Робіць гэта і Генеральная пракуратура.

Перад вызваленнем чалавека мы распытваем, у якія месцы ён накіруецца. Даведваемся, ці ёсць там вольныя працоўныя месцы ў адпаведнасці з яго спецыяльнасцю, ці гатовы сваякі прыняць яго, калі няма свайго жылля, ці гатовы ён сам весці законапаслухмяны лад жыцця.

«З 2012 ПА 2014 ГОД ЗА КРАТАМІ НЕ БЫЛО НІВОДНАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ»

— Тэлефануе бацька Віктар Міхайлавіч. Растлумачце, калі ласка, такую сітуацыю. Мой сын-студэнт пайшоў на дыскатэку, узяў ад некага таблетку. Тут здарыўся рэйд, і ў яго ў кішэнях знайшлі яшчэ пару таблетак. Але ж ён іх першы раз у жыцці ўбачыў: хлопцы яму сказалі паспрабаваць. Ён жа можа апынуцца за кратамі! Нармальны хлопец, добра вучыцца...

Юрый ГАРОШКА:

— У кожным канкрэтным выпадку трэба разбірацца. Якія гэта былі таблеткі, для чаго іх узяў чалавек. Калі ў яго намер ёсць спажыць наркотык — гэта адна гісторыя. Калі хлопца ўвялі ў зман — гэта справа іншая. Таксама трэба размяжоўваць паняцці «спажыванне і захоўванне»... Я так разумею, што крымінальная справа ўжо заведзена?

— Не, гэта проста абыгрыванне сітуацыі, якая можа ўзнікнуць.

— Атрымліваецца, што вы працуеце на прафілактыку? Гэта пахвальна. І хачу выказаць пажаданне: калі ваш сын ходзіць па клубах ці іншых месцах, дзе могуць быць наркотыкі, растлумачце яму дэталёва, што адна такая сітуацыя можа мець вельмі непрыемныя для яго наступствы. Бо існуе верагоднасць таго, што ў дачыненні да хлопца будзе заведзена крымінальная справа, калі яго зловяць з наркатычнымі сродкамі. Наколькі яна вялікая — сказаць не магу, трэба знаёміцца з абставінамі канкрэтнай справы.

— Непакоіць Людміла. У апошні час наркадылеры ўцягваюць у сваю справу зусім маладых хлопцаў. Траплялі звесткі пра гэта і ў прэсу. Ці не плануецца стварыць дзіцячую калонію для такіх падлеткаў або заснаваць спецыяльныя атрады пры ўжо дзейных калоніях?

«Пытанне пра сёлетнюю амністыю разглядаецца. Верагоднасць яе абвяшчэння даволі высокая».

Сяргей ДАРОШКА:

— У нашай краіне працуе ўсяго адна дзіцячая калонія. Там змешчаны 177 чалавек. Да пачатку «шэсця» спайсаў у гадавым вылічэнні ў следчых ізалятарах знаходзілася не больш за 50 дзяцей, у калонію з іх трапляла прыкладна траціна. А вось дзяўчынак у месцах пазбаўлення волі ўвогуле не было з 2012 па 2014 год. І гэтая дынаміка нас вельмі радавала. Мы ўжо падумвалі над тым, каб адмовіцца ад паняцяў «дзіцячая калонія», «выхаваўчая калонія» і стварыць спецыялізаваны выхаваўчы цэнтр.

Сваёй мэтай мы ставім карэкціроўку паводзінаў няпоўнагадовых асуджаных і іх адукацыю, а таксама прафілактыку далейшых канфліктаў з законам. І гэта дае плён. Калі звярнуцца да гісторыі дзіцячай калоніі ў Бабруйску, то з яе сцен выйшлі два палкоўнікі, два алімпійскія чэмпіёны.

Мы не плануем стварыць асобную калонію для няпоўнагадовых, асуджаных па «наркатычных» артыкулах, але хочам стварыць асобнае аддзяленне для гэтых дзяцей. І асноўны ўпор будзе рабіцца на медыцынскі аспект, бо амаль усе яны нарказалежныя — спажывалі спайсы ці іншыя рэчывы. З псіхалагічнага пункту гледжання ў іх яшчэ няўстойлівыя характары, і мы можам за іх змагацца. І пастараемся не прайграць. Наша мара — каб мы гэтую калонію таксама закрылі...

ЦІ ЧАКАЦЬ АМНІСТЫЮ?

— Брэст на лініі. Ці няма планаў перавесці турэмную медыцыну пад юрысдыкцыю Міністэрства аховы здароўя?

«У краіне не плануецца стварыць асобную калонію для няпоўнагадовых, асуджаных па «наркатычных» артыкулах».

Сяргей ДАРОШКА:

— Маё стаўленне да гэтага адназначна адмоўнае. Турэмная медыцына мусіць заставацца ў турме. Усё павінна быць у адным ведамстве. Як толькі чымсьці пачынаюць кіраваць розныя структуры, гэта толькі шкодзіць агульнаму выніку працы.

Падрыхтоўка і перападрыхтоўка супрацоўнікаў праходзіць па такіх жа нормах, як і ў Міністэрстве аховы здароўя. Яно ж нас жорстка кантралюе. Ёсць у нас нават кандыдат навук, які з'яўляецца начальнікам медыцынскай часці ў адной з калоній.

— Гродна, Уладзімір. Як папярэдняя амністыя адлюстравалася на паказчыках крымінагеннай абстаноўкі? І ці будзе абвешчана яна сёлета?

Сяргей ДАРОШКА:

— У гісторыі Беларусі гэта не першая амністыя. Колькасць вызваленых па амністыі, якія пасля здзейснілі злачынства, не перавышае 10%. Гэта добрая лічба. Перад кожнай амністыяй праводзіцца сур'ёзная аналітычная праца. Яна скіравана на вызначэнне тых катэгорый людзей, якім «зніжак» ад дзяржавы не будзе. Гэта асуджаныя па пэўных артыкулах, а таксама злосныя парушальнікі парадку адбывання пакарання.

Юрый ГАРОШКА:

— Пытанне пра сёлетнюю амністыю разглядаецца. Верагоднасць яе абвяшчэння даволі высокая. Пакуль што плануем яе прымеркаваць да 70-годдзя Перамогі. Да 16 красавіка мы падрыхтуем праект Указа аб амністыі.

— Звяртаецца Іван з Быхава. Мой бацька змешчаны ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Нядаўна чуў, што як быццам бы неўзабаве пачнуць адпраўляць у гэтыя месцы і пенсіянераў. Ці сапраўды гэта так?

Юрый ГАРОШКА:

— Такія думкі выказваюцца. І на мой погляд, яны маюць права на існаванне. Ёсць катэгорыя людзей, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, але вядуць асацыяльны лад жыцця, ад яго моцна церпяць суседзі, родзічы. Але адкрыта гэтае пытанне пакуль не разглядаецца.

Сяргей ДАРОШКА:

— Выкажу сваю пазіцыю. Калі пенсіянеры, якія злоўжываюць алкаголем, перашкаджаюць жыць іншым, яны павінны быць ізаляваны і накіраваны ў прафілакторый. Бо такія людзі могуць здзейсніць больш цяжкія злачынствы. Выйсце мы бачым у стварэнні асобных атрадаў для людзей сталага ўзросту. Кожны пенсіянер атрымлівае грашовую дапамогу ад дзяржавы. Хай ён плаціць за пражыванне, лячэнне і камунальныя паслугі, але пры гэтым можа не працаваць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■

■ Беражыце сябе!

ВОГНЕННАЯ «ВАЙНА» Ў МІРНЫ ЧАС

Калі выбрацца з горада на прыроду, то вока непрыемна рэжуць велізарныя чорныя плямы зямлі, па якой прайшоўся агонь. І хоць даўно ўжо абвергнуты міф пра тое, што веснавыя палы травы прыносяць хоць нейкую карысць, але на вёсцы яны сталі ўжо сумнай нормай. Навошта марнаваць час, каб грэбці траву, ламаць галаву над тым, як вывезці смецце? Куды прасцей чыркануць запалкай і пакінуць далейшую працу «чырвонаму пеўню». Але што будзе далей? Як мінімум, моцна пацерпіць экасістэма месца, праз якое прайшоў пал. Як максімум, агонь вырвецца на волю і пачне пакідаць пасля сябе пейзажы ваеннага часу, ператвараючы ў попел жыллё і хатні скарб. Па звестках Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, палы травы забралі сёлета больш за дзесяць жыццяў. Праўда, колькасць такіх пажараў павінна зменшыцца: у Беларусь прыйшлі дажджы...

ЧУЖЫЯ ТРАГЕДЫІ — НЕ ЎРОК?

Гарыць трава, палаюць жылыя дамы і гаспадарчыя пабудовы, траўміруюцца і нават гінуць людзі. Гэта не зводкі з вайны, а паведамленні, якія штодзённа паступаюць у службу «101».

Вёска Дэбесі Ашмянскага раёна: полымем ад загарання сухой раслінасці знішчаны дом і тры хлявы, атрымалі пашкоджанні яшчэ два дамы, што выкарыстоўваюцца пад дачы. Хутар паблізу вёскі Батукі Іўеўскага раёна: агонь знішчыў гаспадарчую пабудову і пашкодзіў лазню. Хутар Харукова Смаргонскага раёна: загінула гаспадыня 1940 года нараджэння. Мяркуемая прычына трагедыі — неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас спальвання сухой раслінасці.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Пры гэтым даволі распаўсюджана меркаванне, што выпальванне сухой травы — справа карысная. Маўляў, гэта паскарае рост маладой травы, глеба ўдабраецца попелам, гінуць кляшчы і іншыя шкоднікі. Вось якімі аргументамі абвяргае гэтыя міфы **Гродзенская гаррайінспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Пры спальванні сухой раслінасці арганіка згарае на корані, гінуць карысныя насякомыя і жывёлы, мікраарганізмы, насенне маладой травы. Ранейшага разнастраўя ўжо не будзе — гэтую тэрыторыю захопіць пустазелле. Магчыма, некаторыя кляшчы не выратуюцца, але разам з імі загінуць і божыя кароўкі, жужалі, дажджавыя чарвякі і іншыя насякомыя, якія вынішчаюць шкоднікаў саду, агарода і ўдзельнічаюць у працэсе глебаўтварэння. Тыя ж дажджавыя чарвякі перапрацоўваюць сухую траву ва ўгнаенне, уносячы яго ў глыбіню глебы да каранёў раслін, і адначасова разрыхляюць, «ажыўляюць» яе.

Згодна з артыкулам 15.57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, за спальванне сухой раслінасці можна паплаціцца штрафам у памеры ад 10 да 40 базавых велічынь. Штрафныя санкцыі пагражаюць і службовым асобам, якія своечасова не арганізавалі ачыстку тэрыторый гаспадарчых аб'ектаў ад сухой раслінасці.

З улікам трывожнай сітуацыі меры пакарання будуць прымацца па ўсёй строгасці закону, пра што папярэджвае **Гродзенскае абласное ўпраўленне МНС.**

АКОЛЬНІК УРАТАВАЛІ ЦУДАМ

Амаль гадзіну 40 чалавек адстойвалі вёску Пружанскага раёна, якой пагражала знішчэнне.

— Ніколі б не падумаў, што зялёная здаровая сасна за секунды ўспыхвае як свечка, пры гэтым агонь паглынае яе з гукам, падобным да выбуху, — дзяліўся сваімі ўражаннямі ад пажару фотакарэспандэнт Валерый Кароль. — Па сухой траве полымя распаўсюджваецца за імгненні, невялікі ўчастак на вачах ператвараецца ў мора агню, утаймаваць якое вельмі і вельмі цяжка.

Калегі вярталіся з камандзіроўкі па аб'язной дарозе вакол Белавежскай пушчы, калі іх сталі абганяць пажарныя машыны. Падумалі адразу, што недзе зноў бяду ўчынілі вясновыя палы. І не памыліліся. Да вёскі Акольнік на мяжы Пружанскага і Камянецкага раёнаў падступаў агонь. Полымя літаральна бегла па сухой у рост чалавека траве і падступала да крайніх хлявоў.

Начальнік Пружанскага райаддзела МНС Аляксандр ГАНЧАРОЎ расказаў карэспандэнту «Звязды», што першым тады на месца прыбыў камандзір Шарашоўскага аддзялення Вячаслаў Янушкевіч, ацаніў становішча і выклікаў падмогу. Пакуль імчалі выратавальнікі з Пружан, Клепачоў, Сухопаля і нацыянальнага парка «Белавежская пушча», шарашоўскія пажарныя адстаялі першыя хлявы. Полымя залівалі вадой і збівалі лапатамі. Агонь тым часам падступаў да лесу. Сосны ўспыхвалі, як ужо гаварылася, з выбухам і загаралі за лічаныя секунды.

Праз некалькі хвілін на месцы быў начальнік каравула з Пружан Аляксандр Кукса, а яшчэ праз хвіліну-другую і начальнік райаддзела Аляксандр Ганчароў, які да гэтага выехаў на пажар у суседнюю вёску. Адстойвалі адначасова і вёску, і лес. Небяспека пагражала таксама лясному масіву пушчы. Пажарным на падмогу прыйшлі леснікі нацыянальнага парка, а таксама працаўнікі сельгаспрадпрыемства «Пружанскі райагрэсэрвіс». Сорак чалавек і дзевяць адзінак тэхнікі не пусцілі агонь да пабудоў. У Акольніку жывуць у асноўным пажылыя людзі. Некаторым ад перажытага стрэсу стала дрэнна, давялося выклікаць медыкаў і аказваць дапамогу.

І ўсё праз нечую амаль што злачынную неабачлівасць! Аляксандр Ганчароў сказаў, што ў дачыненні да аднаго вяскоўца вядзецца праверка. Ён падазраецца ў тым, што выкінуў попел з вуглямі ў сухую траву, ад чаго ўзнік пажар. Калі яго віна будзе даказана, нацыянальны парк мае намер выставіць іск за нанесеную шкоду прыродзе. Гэта будзе вельмі ўнушальная сума.

Галоўнае, што вёску ўдалося выратаваць. Дапамаглі аператыўнасць, зладжанасць усіх службаў, а яшчэ аб'язная дарога, па якой пажарныя разлікі прыбылі на месца за лічаныя хвіліны... Пажар у Акольніку па прычыне вясновых палаў быў 60-ты ў Пружанскім раёне за гэтую вясну.

Барыс ПРАКОПЧЫК, Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Здарэнні

КРАДЗЕЖ ЗАМАСКІРАВАЛА... ПАД РАЗБОЙ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама і Маскоўскага РУУС сталіцы затрымалі 18-гадовую мінчанку, якая падазраецца ў здзяйсненні крадзяжу ў цырульні па вуліцы Ясеніна.

Міліцыянерам паступіла паведамленне, што літаральна пяць хвілін таму туды зайшоў невядомы мужчына, які, пагражаючы нажом, забраў грошы і знік. Прыбыўшым праваахоўнікам тая самая 18-гадовая супрацоўніца цырульні распавяла, што напачатку незнаёмец папрасіў размяняць 200 тысяч рублёў, а калі яна падышла да касы, то прыставіў нож і забраў больш за 2,6 мільёна рублёў выручкі. Пры гэтым, як гаварыла дзяўчына, ёй былі нанесены цялесныя пашкоджанні. Пра здарэнне «пацярпелая» паведаміла маці, а ўжо тая — дырэктару салона і міліцыянерам. А далей гісторыя атрымала нечаканы працяг...

Цырульня была абсталявана камерамі відэаназірання. Праглядзеўшы запісы, праваахоўнікі ўстанавілі, што ў цырульню сапраўды заходзіў мужчына. Аднак потым, калі дзяўчына падышла да памяшкання адміністратара, запіс чамусьці абрываўся... Пазней высветлілася, што камеры адключыла сама дзяўчына. Тая прызналася, што невядомы сапраўды папрасіў размяняць грошы і сышоў. А яна вырашыла ўзяць выручку сабе. Грошы ёй былі патрэбны на падарунак на дзень нараджэння хлопца. Аднак да таго не дайшло — сродкі былі патрачаны на ўласныя патрэбы. У адносінах да затрыманай заведзены крымінальныя справы за лжывыя данос і паказанні, а таксама за здзяйсненне крадзяжу.

СЛЕСАРЫ ПАПАЛІСЯ З МАРЫХУАНАЙ

Супрацоўнікі сталічнага АМАП і аператыўнікі наркакантролю Цэнтральнага РУУС падчас начнога рэйду па забаўляльных установах за захаванне марыхуаны затрымалі двух 24-гадовых слесараў. Маладыя людзі трапілі ў поле зроку праваахоўнікаў не ў саміх клубах, а ў наваколлі.

Каля гадзіны ночы на вуліцы Зыбіцкай затрымалі аднаго з хлопцаў. Пры сабе ў яго была марыхуана, загорнутая ў папяровыя скруткі, а таксама прыстасаванне для яе ўжывання. А крыху раней у дварах па праспекце Незалежнасці быў затрыманы яшчэ адзін хлопец. Ён знаходзіўся ў кампаніі дзяўчыны, якой і прапанаваў ужыць наркотык. За гэтым заняткам іх і заспелі міліцыянеры. Марыхуана была ў сумцы маладога чалавека. У дачыненні да ўсіх фігурантаў заведзены крымінальныя справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗА КАНЬЯК КАНФІСКАВАЛІ АЎТОБУС

Радыёдэталі ў заводскай упакоўцы на суму Br91 млн рублёў затрыманы ў цягніку «Мінск — Кіеў». Іх спрабавалі правезці праваднікі аднаго з вагонаў, якія адмовіліся загадзя задэкларацца свой груз.

У прэс-групе Гомельскай мытні расказалі, што дэталі знаходзіліся на дне скрыні пад дарожнымі сумкамі разам з асабістымі рэчамі і цяпер канфіскаваны. А ў пункце «Новая Гута» пры аглядзе аўтобуса Mercedes, які ажыццяўляў перавозку пасажыраў з Малдовы ў Расію, мытнікі і памежнікі звярнулі ўвагу на магчымую змену канструкцыі багажных паліц. Пасля іх дэмантажу выявілі 30 паўтаралітровых бутэлек каньяку дзесяцігадовай вытрымкі. Кіроўца-малдаванін прызнаўся ў незаконным перасоўванні тавару. Каньяк на Br6 млн і аўтобус арыенціровачным коштам Br250 млн канфіскаваны. Распачаты адміністрацыйны працэс.

АТРУТНЫЯ «ЗАКЛАДКІ»

Чатыры мужчыны і 17-гадовая дзяўчына праходзяць па шматэпізоднай справе аб незаконным абароце наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў.

У прэс-службе ўпраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці расказалі, што паўналетнім фігурантам справы (жыхары Гомеля і Мінскага раёна) прад'яўлена абвінавачванне ў незаконным набыцці і захоўванні для асабістага спажывання 7,49 грама гашышу. Палімерныя пакеты з небяспечным наркатычным сродкам праваахоўнікі канфіскавалі па месцы жыхарства, працы абвінавачваемых, у аўтамабілі. Юная гамяльчанка знаходзіцца ў статусе падазраванай.

Акрамя таго, устаноўлена дачыненне чацвярых мужчын да збыту атрутнага зелля праз «закладкі» ў Гомелі (не менш за 5,15 грама). 24-гадовы гамяльчанін падазраецца таксама ў незаконным збыце праз інтэрнэт не менш за 43,57 грама здробненага расліннага наркотыку.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БУЛЬБАКАПАЛКА БЕЗ ПАШПАРТА

Кантрабандны груз затрыманы на мяжы Расіі з Беларуссю ў раёне вёскі Звянчатка Клімавіцкага раёна. Пры праверцы расійскай фуры «ДАФ» з паўпрычэпам мытнікі знайшлі 130 адзінак няўлічанай тэхнікі ў выглядзе калясак матаблока, прычэпаў, бульбасаджалак і бульбакапалак. Ніякіх суправаджальных дакументаў на перавоз гэтага грузу ў кіроўцы не знайшлося. Тавар на 230 мільёнаў арыштаваны, яго лёс вызначыць суд.

Аналагічная сітуацыя склалася і па будматэрыялах. Расійскую фуру, якая іх перавозіла, мытнікі затрымалі на аўтадарозе Мсціслаў — Хіславічы. Пры аглядзе грузавога адсека знойдзены еўравагонка, палавая дошка, блок-хаус без абавязковых фітасанітарных сертыфікатаў. У мытнікаў не было іншага выйсця, як увесь гэты груз агульным коштам 84 мільёны рублёў арыштаваць. Матэрыялы справы перададзены ў эканамічны суд Магілёўскай вобласці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ГРАНАТА НА БАЛКОНЕ

У Маскоўскае РУУС сталіцы паступіла інфармацыя пра тое, што ў адной з кватэр дома па вуліцы Р. Люксембург знойдзены невялікі арсенал.

Следча-аператыўная група высветліла на месцы, што раней у гэтым жыллі пражываў гаспадар 1928 года нараджэння. Пасля яго смерці ў кватэру ўехалі новыя ўладальнікі, якія на балконе і знайшлі гранату без узрывальніка, дымавую шашку і патроны — усё часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Бліжэй да людзей

НАВІНЫ З ВОДАРАМ КАВЫ

«Белсаюздрук» запрашае. Пакупнікам рады прадаўцы Вольга КОРЫК і Крысціна ЯРАХАВЕЦ.

...Раніца. Прыпынак. Шапік «Белсаюздруку». З гэтага, з пакупкі свежых газет, дзень пачынаецца ў многіх гараджан. І што, вядома ж, добра, вельмі многія з іх могуць сумяшчаць цяпер прывычнае з досыць нечаканым. Гэта значыць, купіўшы свежы нумар газеты, яшчэ і пагартаць яго — за кубачкам кавы.

— Нашы гандлёвыя пункты (а іх у Мінску 362) пачынаюць працаваць у 6-7 гадзін раніцы, — гаворыць **намеснік дырэктара прадпрыемства «Белсаюздрук» Аксана ВАЛГАЙ**. — Крамы ды кавярні ў гэты час яшчэ зачынены. Вось мы і паспрабавалі сустракаць мінчан ды гасцей сталіцы не толькі свежымі навінамі, але і гарачай кавай. Спачатку яе прапаноўвалі ў нашых крамах, а цяпер — ужо і ў шапіках. Яны адкрываюцца ў новых мікрараёнах, а таксама ўсталёўваюцца на месцы прывычных, старых. Нядаўна, у прыватнасці, свой гандлёвы пункт не пазналі пакупнікі сталічнай Нямігі.

Там, на прыпынку грамадскага транспарту, на месцы добра вядомага шапіка, з'явілася хоць невялічкая, але ж сапраўдная ўтульная крамка — з куды большай плошчай паліц. На іх — свежыя газеты і часопісы, кнігі, паштоўкі, карты горада, сувеніры, у тым ліку — да 70-годдзя Вялікай Перамогі... Што важна, усё гэта пакупнік можна не проста ўбачыць, а патрымаць у руках, пагартаць, прыцаніцца, выбраць патрэбнае. Прычым не выключана, што ім, тым патрэбным, у насамрэч крокавай даступнасці (амаль усе гандлёвыя пункты прадпрыемства размешчаны ў самых бойкіх месцах горада) стане і кубачак кавы.

Фотаздымкі Аляксандра ШАБЛЮКА.

— Сюды, ну вядома ж, можна зайсці і для таго, каб падсілкавацца, — працягвае спадарыня Валгай. — А заадно — знайсці нешта цікавае для сябе з перыёдыкі, з кніг — для дарослых, для дзяцей... У кнігарні ж мы не так часта ходзім. А моладзь дык і наогул чытае цяпер хіба ў тэлефонах ды інтэрнэце. Дык хай паглядзіць, што ёсць яшчэ і друкаваная прадукцыя. Мы пастаянна пашыраем яе асартымент, павышаем якасць абслугоўвання.

Гэта, як і варта было чакаць, не можа не адбівацца на выніках працы: у новых гандлёвых пунктах прыкметна ўзрастае продаж перыёдыкі, кніг, асабліва дзіцячай літаратуры... Што і зразумела, бо, паказваючы тавар найлепшым чынам, маем болей шанцаў яго прадаць.

Валянціна ДОЎНАР

■

ХТО ВЯСКОЎЦУ ДАПАМОЖА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пажылым людзям неабходна не толькі ўпарадкаваць свае надзелы, але і падстрыгчыся, адрамантаваць абутак... У Валожынскім раёне на сяле працуюць 11 комплексных прыёмных пунктаў.

— Як кажуць, пад ляжачы камень вада не цячэ. Я не проста прашу, а прымушаю прыёмшчыкаў заходзіць у кожны дом, высвятляць, у чым маюць патрэбу гаспадары. Здараецца, што чалавеку нестае часу наведаць комплексны пункт, а некаму і здароўе не дазваляе.

І такі падыход дае свае вынікі: кожны з комплексных прыёмных пунктаў аказвае паслуг больш як на 19 млн рублёў у год.

— Напэўна, у вас і канкурэнтаў нямала? — пацікавілася ў Леаніда Васільевіча. — Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, сельсаспрадпрыемствы, сельскія Саветы, якія таксама аказваюць паслугі вяскоўцам.

— Гэта не канкурэнцыя, а дапамога жыхарам, — адказаў Леанід Акотчык. — Раён вялікі, і работы ўсім хопіць.

Камбінат бытавога абслугоўвання мае і сваю прамысловую базу: зварачны, сталярны цэхі, піларраму, млын.

— Я трымаю ў гаспадарцы курэй, парасят. Звычайна прывожу малоць па мяшку зерня: на два тыдні хапае. Расцэнкі мяне задавальняюць — 500 рублёў за кілаграм, такіх ужо нідзе не знойдзеш. Ды ў Валожыне ніхто больш і не аказвае такую паслугу. Праўда, раней гэтым займаўся індывідуальны прадпрымальнік, але кошт за адзін кілаграм у яго быў 750 рублёў, — расказаў мясцовы жыхар Андрэй Бізун.

Побач з памяшканнем, дзе ўладкаваны млын, выстаўлены ўзоры сталярнай прадукцыі: альтанка, фрагмент агароджы са штыкетніку. Прыехаў чалавек, напрыклад, на млын, а заадно і плот замовіў.

Мельніка Рамана Бурко я застала за справай.

— Бывае, адну, а то і тры тоны зерня прывозяць вяскоўцы на перапрацоўку: па-рознаму здараецца. Цяпер дазволілі свіней трымаць. Мяркую, аб'ёмы павялічацца, — лічыць Раман Часлававіч.

Што тычыцца зарплаты, то яна ў памеры 3-3,5 млн рублёў.

— Вясной будзе больш заказаў, і платы новыя людзям патрэбны, і альтанкі на дачы, адпаведна і заробкі падрастуць, — уступае ў размову Валерый Зайцаў.

Валерый Рыгоравіч — сталяр, але калі трэба, то можа падмяніць калегу. Жыве ён у вёсцы Бабровічы, трымае вялікую гаспадарку.

— А дзе здабываеце корм для жывёлы? — пацікавілася ў яго.

— Запісваюся ў агульны масіў...

— Куды? — перапытваю ў яго.

У адказ ён смяецца:

— Кожную вясну сельгасарганізацыя збірае заяўкі, колькі каму пасеяць зерневых. Хтосьці заказвае 20 сотак, а нехта і больш. Калгас засявае поле, збірае ўраджай, а восенню прадае з заяўленага ўчастка прадукцыю па прымальных цэнах. Гэта вельмі зручна. На рынку камбікорму не накупляешся — нашмат даражэй, нават з улікам затрат на памол.

Усяго на сённяшні дзень камбінат аказвае насельніцтву 18 відаў бытавых паслуг, за мінулы год у грашовым памеры яны прынеслі 6 млрд 123 млн рублёў. Сёлета іх аб'ём запланаваны на ўзроўні 7 млрд рублёў.

— Мы не пайшлі шляхам здачы плошчаў у арэнду, усе яны заняты пад вытворчасці: швейныя, рамонтныя, цырульню, фотаатэлье. У ліпені мінулага года адкрылі краму «Бытавічок» для рэалізацыі сваіх тавараў. Дарэчы, усе яны выраблены з матэрыялаў айчынных вытворцаў, — канстатаваў дырэктар. — Акрамя таго, на кожным з іх таблічка з інфармацыяй, што рэч могуць сшыць ці вырабіць па заказе пакупніка, па яго гусце, памеры.

Леанід Акотчык сем гадоў узначальвае прадпрыемства. Спадчына яму дасталася не з лёгкіх, давялося пачынаць усё нанова: ад рамонту будынка камбіната да мадэрнізацыі старых і стварэння новых вытворчасцяў, набыцця тэхнікі. Напрыклад, тая ж машына для ачысткі пухавых і пер'евых вырабаў ужо акупілася спаўна. Вялікім попытам карыстаюцца і фастрыгаваныя коўдры, што вырабляюцца на сучасным абсталяванні. Дадам, што ў абнаўленне вытворчасці ўкладзены грошы, што зарабілі калектывам.

Працаўнікам ёсць з чым параўноўваць: як было раней і як стала цяпер. Людзі працуюць у камфортных умовах, маюць магчымасць за кошт наймальніка і прафсаюза ездзіць на экскурсіі, наведваць музеі і канцэрты. Пабывалі і за мяжой. У дырэктара шмат задум на перспектыву, але раскрываць іх не стаў, каб не сурочыць.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Сталічнае жыццё

Горад пераўтвараецца з кожным днём

Час збіраць каменне і... высаджваць кветкі

Сталіцу захапіў «бум» суботнікаў: на працы па добраўпарадкаванні Мінска выходзяць студэнты, ветэраны, жыхары раёнаў. На тэрыторыі зон адпачынку гарадскіх і загарадных лясоў работнікі Мінскай лесапаркавай гаспадаркі таксама праводзяць санітарныя рубкі, прыбіраюць смецце і прыводзяць у парадак пляжы. Гарачая пара наступіла і для «Зелянбуда»: вуліцы ўжо рыхтуюцца заквітнець. Пра гэта, а таксама пра заробкі і рэканструкцыю ў горадзе ішла гаворка падчас аператыўнай нарады ў Мінгарвыканкаме.

ЗАРОБКІ ПАДЛІЧЫЛІ

— Праца па забеспячэнні своечасовай заработнай платы ў арганізацыях Мінска, а таксама маніторынг узроўню зарплаты знаходзіцца на пастаянным кантролі ў камітэце і будзе працягнута ў далейшым, — заявіў **першы намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама — галоўны дзяржаўны эксперт г. Мінска па ўмовах працы Дзяніс КАПІТАН.**

Ён паведаміў, што намінальная сярэднямесячная заработная плата ў сталіцы за студзень-люты 2015-га склала 8,4 млн рублёў. Пры гэтым у сферы тэкстыльнай і швейнай вытворчасці заробкі склалі каля 5 мільёнаў, а ў сферы фінансавай дзейнасці — больш як 13 мільёнаў рублёў.

Работнікі бюджэтных арганізацый Мінска за два першыя месяцы года зарабілі ў сярэднім 6 мільёнаў. Рэальная заработная плата бюджэтнікаў з улікам індэкса росту спажывецкіх коштаў у параўнанні з аналагічным перыядам 2014 года вырасла на 3,5%.

КАМУ — ХРАМЫ, А КАМУ — КРАМЫ

Сёлета плануецца завяршыць рэканструкцыю квартала Верхні горад. **Дырэктар прадпрыемства «Мінская спадчына» Павел ШЫКУНЕЦ** распавёў, што тут збіраюцца ўвесці ў эксплуатацыю Духоўна-адукацыйны цэнтр Беларускай праваслаўнай царквы на вул. Гандлёвай і будынак грамадска-гандлёвага прызначэння з аб'ектамі гандлю, гасцініцай і аўтастаянкай, размешчаны ў межах вул. Інтэрнацыянальнай — вул. Энгельса — зав. Музычнага.

Таксама сёлета мусіць завяршыцца рэканструкцыя будынкаў №№ 31 і 33 на вул. Інтэрнацыянальнай. Тут з'явяцца аб'екты грамадскага харчавання і грамадска-бытавога прызначэння.

— На тэрыторыі Траецкага прадмесця ў поўным аб'ёме завершана рэканструкцыя будынкаў на вул. Старавіленскай, заменены знешнія інжынерныя сеткі, пабудавана наземная плоскасная аўтастаянка, добраўпарадкавана тэрыторыя, устаноўлены малыя архітэктурныя формы. У 2015 годзе будуць выкананы работы па пароме на набярэжнай ракі Свіслач, дзе будзе адкрыта летняя кавярня, — дадаў Павел Шыкунец.

Вядуцца працы і на шэрагу іншых аб'ектаў гістарычнага цэнтра горада. Усяго да гэтага часу тут ужо ўведзена ў эксплуатацыю 96 аб'ектаў, сярод якіх гарадская ратуша, канцэртная зала «Верхні горад», два гасцінічныя комплексы на вул. Замкавай і вул. Кірыла і Мяфодзія і іншыя.

На думку **старшыні Мінгарвыканкама Андрэя ШОРЦА**, у гістарычным цэнтры горада неабходна фармаваць камфортнае інфармацыйнае асяроддзе для турыстаў. Гэта дапаможа зрабіць устаноўка інфармацыйных стэндаў, у тым ліку інтэрактыўных, па якіх можна сарыентавацца, атрымаць звесткі пра аб'екты, размешчаныя на той ці іншай вуліцы.

СТАЦЬ ЛЕПШЫМ ДАПАМАГАЮЦЬ... ГРАБЛІ

Апроч новых аб'ектаў, Верхні горад, Траецкае і Ракаўскае прадмесці і прылеглыя тэрыторыі ўпрыгожаць разнастайныя кветкавыя кампазіцыі. Работы па кветкавым афармленні горада пачнуцца пасля 20 красавіка з надыходам спрыяльнага для пасадкі перыяду. Цяпер жа ў сталіцы працягваецца месячнік па добраўпарадкаванні тэрыторыі. У яго рамках прайшла і акцыя, ініцыяваная Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі «Стань лепшым — зрабі горад чысцейшым».

— Нашы актывісты па ўсім горадзе робяць свой унёсак у добраўпарадкаванне сталіцы. Самая маштабная акцыя прайшла ў Парку Перамогі, і гэта сімвалічна, таму што сёлета мы адзначаем 70-годдзе перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, — распавёў **першы сакратар мінскага гарадскога камітэта БРСМ Юрый ЧАЧУКЕВІЧ.**

У гарадской акцыі ў Парку Перамогі ўзялі ўдзел каля 150 актывістаў БРСМ, якія згрэбалі леташняе лісце і збіралі смецце. Да моладзі далучыліся і 60 прадстаўнікоў Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў.

— Ветэраны хочуць жыць актыўным грамадскім жыццём і гэтак жа актыўна сустрэць свята Перамогі. Таму мы пастаянна ўдзельнічаем у розных мерапрыемствах, звязаных з ушанаваннем памяці тых, хто пайшоў з жыцця і абараняў нашу Радзіму, — адзначыў **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў генерал-маёр Анатоль АДОНЬЕЎ**. — Мы стараемся быць разам з моладдзю, таму што тады адбываецца дыялог пакаленняў. Ветэраны паказваюць маладым, што заўсёды трэба быць баявымі, энергічнымі, рабіць усё для таго, каб наша краіна станавілася прыгажэйшай.

Адметна, што для прыборкі тэрыторыі ветэраны і моладзь не размеркаваліся кожны да сваёй «кампаніі», а аб'ядноўваліся ў агульныя групы.

На маладзёжную акцыю ў Парк Перамогі завіталі і ганаровыя госці. Моладзь і сваіх калег-ветэранаў павітаў Браніслаў Карпенка, які адным з першых увайшоў у вызвалены Мінск у 1944 годзе. Разам з усімі да прыборкі далучыліся прадстаўніцы беларускай зборнай па мастацкай гімнастыцы, сярэбраныя прызёры Алімпійскіх гульняў — 2012 Ксенія Санковіч і Наталля Лешчык. А энергіяй перад работай удзельнікаў суботніка зарадзіў спявак Дзядзя Ваня.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

ДЗЁННІК... У КАНЦЛАГЕРЫ

Яшчэ пра аднаго абаронцу Айчыны, які лічыўся прапаўшым без вестак, цяпер ведаем больш

У наш час, калі мноства дакументаў рассакрэчаны і даступны любому зацікаўленаму чалавеку, архівы дазваляюць знайсці патрэбную інфармацыю і выявіць, дзе пахаваны воін, які лічыўся прапаўшым без вестак. І абавязак ваенных камісарыятаў — дапамагчы людзям у іх жаданні знайсці магілы сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Нядаўна стаў вядомы лёс яшчэ аднаго салдата — ураджэнца горада Петрапаўлаўск Паўночна-Казахстанскай вобласці Івана Майсака.

«Дэсантнік-радыст І.А. Майсак, 1921 года нараджэння, трапіў у палон у лагер для ваеннапалонных салдат і сяржантаў у г. Гродна (па нямецкай тэрміналогіі — шталаг № 324) і памёр ад голаду і хваробы 15 мая 1942 года». Што за гэтымі радкамі афіцыйнага дакумента?

Аказалася, што да вайны сям'я Майсак жыла ў Гродне, а потым пераехала ў Рабочы пасёлак чыгуначнікаў каля Петрапаўлаўска. Іван вучыўся ў сярэдняй школе чыгуначнікаў № 44, якая была ў пасёлку цэнтрам грамадскага і культурнага жыцця. Выдатнік адукацыі Казахстана Эма Красікава параўноўвае гэтую навучальную ўстанову з «белай гордай лябёдкай, што накіравалася ў далёкае плаванне». Ваня Майсак гуляў з равеснікамі ў футбол, вучыўся вадзіць машыну і матацыкл (такія курсы былі ў школе), трапна страляць з вінтоўкі, а таксама чытаў вершы класікаў і маляваў карціны. У школе хлопцам ганарыліся, бачылі ў ім талент мастака. У калідорах і актавай зале размяшчаліся яго пейзажы Паўночнага Казахстана, рэпрадукцыі карцін «Тры асілкі», «Жыта» і іншых. Яму прарочылі вялікую будучыню мастака. Пасля заканчэння школы Іван паступіў і паспяхова закончыў Омскае мастацкае вучылішча, аднак яго далейшы лёс, як і мільёнаў іншых людзей, перайначыла вайна.

Івана Майсака і яго равеснікаў адпраўлялі на фронт усім пасёлкам. Правялі да станцыі, дзе адбыўся мітынг, пажадалі вярнуцца дамоў. Івана праводзіла на вайну яго дзяўчына Зоя Анісімава. У самы апошні момант хлопец успомніў, што забыў узяць з хаты папіросы. Вярнуўся, апошні раз пацалаваў маму, абняў сваіх маленькіх сястрычак Іну і Рыту. І пайшоў, як аказалася, у вечнасць.

Толькі ў 1952 годзе, дзякуючы рабоце Чырвонага Крыжа, у пасёлку даведаліся аб далейшым лёсе свайго земляка. Да ліста з гэтай арганізацыі быў прыкладзены невялікі здымак Івана Майсака — з лагернай карткі ваеннапалоннага. З фота глядзеў моцна знясілены, хворы чалавек, які выглядаў значна старэйшым за свой, на той час дваццацігадовы, узрост — з таблічкай пад лагерным нумарам 8455 на шыі. Але сваякі свайго любімага чалавека пазналі — можа, па вачах.

Цяпер мы ведаем некаторыя факты пра знаходжанне Івана Майсака ў шталагу № 324. Гэта высветлілася дзякуючы перапісцы ваеннага камісарыята Гродзенскай вобласці з яго сястрой Інай Шалькінай, якая жыве ў Петрапаўлаўску. Мы даслалі ёй кнігу былога ўрача канцлагера Давіда Кагана «Раскажы жывым». І Іна Аляксандраўна ў тэксце кнігі ўбачыла аповед пра свайго брата.

Вось што піша Давід Каган:

«Спыняемся каля хворага, які, лежачы галавой да праходу, нешта піша. У руках самаробны блакнот са сшытка, агрызак алоўка. Так паглыблены ў запісы, што нікога не заўважае.

— Пра што пішаш? — пытаюся.

Хлопец падымаецца на карачкі, слабая фарба сарамлівасці выступае на пакрытым брудныміструпкамі твары. Мяркуючы па пушку на верхняй губе, яму гадоў васямнаццаць. Узіраючыся ў мяне, напаўголаса адказвае:

— Дзённік!

Адшпільвае кішэню гімнасцёркі, хоча схаваць блакнот. Вошай на гімнасцёрцы столькі, што ім цесна ў складках каўняра і на рукавах, яны шэрым радком размясціліся па шве кішэні. Тлустыя, марудлівыя.

— Пішы! Пішы! — кажу я.

Трэба адысці, не перашкаджаць. Але хочацца даўжэй пабыць з ім побач, пагрэць сваю душу яго верай. «Нашы прыйдуць абавязкова, але ці застануць яго ў жывых альбо не, а дзённік прачытаюць...»

Лёс гэтага дзённіка, які вёў малады чырвонаармеец у канцлагеры, невядомы. Аднак Іна Шалькіна пераканана, што гаворка ў кнізе Давіда Кагана ідзе менавіта пра яе брата, які любіў запісваць усё, што бачыў, з кім сустракаўся.

...Некалькі гадоў таму імя Івана Майсака ўвекавечылі на помніку брацкай магілы на гарадскіх могілках у Аўльсе. А неўзабаве, да 70-годдзя Вялікай Перамогі, у Гродне каля Кургана Славы перапахаваюць яшчэ каля 1,5 тысячы астанкаў савецкіх ваеннапалонных шталага № 324, якія летась былі эксгумаваны 52-м асобным спецыялізаваным батальёнам на тэрыторыі ваеннага гарадка Фолюш. Сёлета пошукавыя работы там прадоўжацца.

Аляксандр КАВУН,
вядучы спецыяліст ваеннага камісарыята Гродзенскай вобласці, падпалкоўнік запасу.

P.S. Па просьбе аўтара ганарар за публікацыю рэдакцыя пералічвае на спецыяльны разліковы рахунак па зборы сродкаў на рэканструкцыю вайсковых могілак у г. Гродна.

Да 70-годдзя Вялікай Перамогі Гродзенская гарадская арганізацыя ветэранаў і абласное аддзяленне ГА «Беларускі фонд міру» ініцыявалі дабрачынную акцыю «Рэканструюем вайсковыя могілкі разам!»

Вайсковыя могілкі па вуліцы Белуша ў Гродне — гэта ўнікальны мемарыял, дзе знайшлі апошняе прыстанішча салдаты розных войнаў. Сярод іх і 398 байцоў, якія вызвалялі горад над Нёманам у ліпені 1944 года. На рэканструкцыю могілак выдзяляюцца бюджэтныя сродкі, аднак неабходны і дабрачынныя ўзносы. Свой пасільны ўдзел у гэтай высакароднай справе можа ўзяць кожны. Сабраныя сродкі будуць выкарыстаны на добраўпарадкаванне могілак і выраб надмагільных помнікаў.

Грошы можна пералічыць на спецыяльны разліковы рахунак Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру» № 3015575030015 у галаўным філіяле Белінвестбанка па Гродзенскай вобласці, код 739, УНН аддзялення 500039510 з пазнакай «На рэканструкцыю вайсковых могілак у г. Гродна» і абавязковым указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку фізічнай асобы ці працоўнага калектыву, дзе сабраны грашовыя сродкі.

■ Лісты з фронту

«З НЕЦЯРПЕННЕМ ЧАКАЮ ЗАГАДУ «НАПЕРАД»

Пісьмы з фронту бераўліва захоўваюцца ці не ў кожнай сям'і. Пажоўклыя ад часу, з выцвілымі радкамі, яны перадаюцца з пакалення ў пакаленне. У кожнага трохвугольніка свая гісторыя: шчаслівая або сумная. У прапахлых порахам радках — клопат пра сваіх блізкіх, хуткая вера ў перамогу над ворагам...

Пазалетась памерла бабуля Вера. Не дажыла да свайго 90-годдзя месяц. Пахавалі яе на радзіме ў вёсцы Савічы побач з мужам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Цімафеем, і бацькамі: Яўгенам і Тафіляй, якія пражылі таксама больш за 80 гадоў. Вера Яўгенаўна — наша далёкая сваячка, сваіх дзяцей не мела, таму заўсёды гарнулася да нас, як да родных. І мы яе ніколі не пакідалі сам-насам з праблемамі, дапамагалі чым маглі, без гасцінцаў ніколі не пераступалі парог хаты. Жанчына часта ўспамінала свайго адзінага брата Змітрыка (так яго называлі ў сям'і і вёсцы). Дзмітрый Лазоўскі не вярнуўся з фронту. А прызвалі яго ў войска пасля вызвалення Баранавіч у ліпені 1944 года. У свой час, калі яшчэ не было інтэрнэту, мы спрабавалі адшукаць хоць якія звесткі пра яго праз Чырвоны Крыж, звярталіся ў Цэнтральны архіў Савецкай Арміі ў Падольску. Але адусюль атрымлівалі адказ: прапаў без вестак. Між іншым, бабуля Вера да апошніх дзён спадзявалася, што брат жывы. «Можа, у Амерыку падаўся пасля Перамогі, а можа, у Расіі прыжаніўся ці пакалечаны ды не хоча, каб яго такога бачылі родныя і землякі? Як вы думаеце?» — кожны раз пры сустрэчы задавала нам адны і тыя ж пытанні і дапытліва глядзела ў вочы, каб мы пацвердзілі яе «здагадкі». «Магчыма, яно і так, рознае ў жыцці бывае», — адказвалі мы, не хацелі забіраць у старой апошнюю надзею.

Пасля смерці бабы Веры мы разбіралі сямейны архіў і знайшлі адзінае, зусім кароткае пісьмо ад яе брата.

«Добры дзень, дарагія бацькі, сястра і жонка.

Паведамляю, што я жывы і здаровы, чаго і вам жадаю. Цяпер я знаходжуся на адпачынку, вывучаем грозную зброю. Пісем ад вас я не атрымліваю, а высылаў шмат. За ўвесь час атрымаў толькі адно. Напішыце, як жывяце і чым займаецеся. Пішыце на адрас: палявая пошта 20714А. Перадайце маё гарачае прывітанне Ваню Лазоўскаму, Сяргею Правальскаму і Аляксею Лазоўскаму. Што вы маеце ў гаспадарцы? Напішыце. На гэтым заканчваю. З нецярпеннем чакаю загаду «Наперад!», каб разграміць ворага і з хуткай перамогай вярнуцца дадому. Да пабачэння, дарагія, родныя».

Нядаўна зайшла на сайт «Мемарыялу». Тут значыцца: сувязь з Дзмітрыем Яўгенавічам Лазоўскім перарвалася 10 кастрычніка 1944 года, а пісьмо, што ён паслаў дадому, датаванае 19 снежня 1944 года. Значыць, ён быў на той час жывы. Што здарылася з нашым сваяком, як ён загінуў — невядома...

Як згадваюць старажылы, рос Змітрык працавітым і адукаваным хлопцам. Яго бацька Яўген нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Але быў вельмі прагны да ведаў, закончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, вучыў



да яго заўсёды звярталіся са спрэчнымі пытаннямі. Кагосьці памыліць, некага — пасарамаціць, маўляў, трэба жыць у згодзе з людзьмі. А яшчэ, кажуць, падчас вайны ў Савічах не працавала школа — Яўген наадрэз адмовіўся вучыць дзяцей на мове акупантаў.

Разам з Дзмітрыем Лазоўскім прызывалася шмат аднавяскоўцаў. Але не ўсе яны таксама вярнуліся дамоў. Напрыклад, на тым жа сайце лічацца прапаўшымі без вестак чырвонаармейцы Рыгор Іванавіч Кісель і Іван Сцяпанавіч Буйка. Акрамя таго, указаны і прозвішчы жыхароў з населеных пунктаў, што знаходзяцца непадалёку ад Савіч.

Таццяна ГЕОРГІЕВА.

Пра подзвіг чыгуначнікаў...

Перасоўны выставачна-лекцыйны комплекс арганізацыі «Расійская чыгунка» будзе працаваць на Беларускай чыгунцы з 15 па 28 мая. Гэты праект прымеркаваны да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Першы прыпынак комплекс зробіць з 15 па 16 мая ў Віцебску. Далей адправіцца на станцыю Гродна, дзе прабудзе з 17 па 18 мая, а з 19 па 21 мая будзе знаходзіцца на станцыі Мінск-Пасажырскі. З 22 па 23 мая зробіць прыпынак у Брэсце. З 24 па 26 мая перасоўны выставачна-лекцыйны комплекс будзе ў Гомелі. Апошняй станцыяй стане Магілёў, дзе ён прабудзе з 27 па 28 мая. Адтуль цягнік вернецца ў Маскву. Як расказалі ў прэс-цэнтры магістралі, графік работы комплексу — з 9.00 да 18.00, уваход свабодны.

Цягнік уключае ў сябе восем выставачных вагонаў, у якіх прадстаўлены макеты сучаснага рухомага саставу расійскай чыгункі. У іх можна пазнаёміцца з гісторыяй развіцця айчыннай чыгункі, а таксама сучаснымі інавацыйнымі дасягненнямі расійскай чыгункі.

Асаблівае месца будзе адведзена экспазіцыі, прысвечанай 70-годдзю Перамогі, дзе размесцяцца матэрыялы пра ўклад беларускага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. За мужнасць і гераізм 20 айчынных чыгуначнікаў сталі Героямі Савецкага Саюза. Абарона Брэсцкага вакзала — адна з яркіх і трагічных старонак першых дзён вайны. Імёны шасці яго абаронцаў увекавечаны на мемарыяльнай дошцы на абноўленым будынку вакзала. Асаблівую ролю ў арганізацыі абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі адыгралі бронецягнікі, традыцыя пабудовы якіх адрадзілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ужо ў першыя дні на чыгунках БССР уступілі ў бой дзесяць бронецягнікоў НКУС.

Адной з найважнейшых задач чыгуначнікаў у пачатковы перыяд вайны стала эвакуацыя асабліва каштоўных рэчаў і дакументаў. Агулам яны вывезлі 1,5 мільёна чалавек, не лічачы рабочых і служачых. Было эвакуявана 109 буйных прадпрыемстваў, каштоўнасці, больш за 5 тысяч вагонаў гатовай прадукцыі, сыравіны. У тыл быў пераважна адпраўлены рухомы састаў, абсталяванне чыгуначных вузлоў Мінска, Оршы, Віцебска, Магілёва, Жлобіна, Гомеля і іншых.

Бессмяротную славу здабылі сабе аршанскія падпольшчыкі і кіраўнік арганізацыі Аршанскага чыгуначнага вузла, пазней камандзір партызанскага атрада Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў. Баявая дзейнасць беларускіх партызан, у тым ліку на чыгунцы, працягвалася падчас усёй акупацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ОАО «Торгразвитие»

Учетный номер плательщика: 100041437
Вид экономической деятельности: розничная торговля
Единица измерения: млн. руб.
Адрес: г. Минск, ул. Вильямса, дом 45

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	180	3 834
Нематериальные активы	120	28	
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131		-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	6	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	5 104	4 058
Отложенные налоговые активы	160		-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180		4
ИТОГО по разделу I	**190**	**5 318**	**7 896**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	997	943
в том числе:			
материалы	211	52	77
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	945	866
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	4	-
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	85	85
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	1 223	103
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	295	146
Прочие краткосрочные активы	280		-
ИТОГО по разделу II	**290**	**2 604**	**1 277**
БАЛАНС	**300**	**7 922**	**9 173**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код строки**	**На 31 декабря 2014 года**	**На 31 декабря 2013 года**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	3 027	5 199
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	12	12
Добавочный капитал	450		1 490
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	941	126
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	1 525	1 066
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**5 505**	**7 893**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	11
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**11**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	2 398	1 269
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 456	881
по авансам полученным	632	293	102
по налогам и сборам	633	303	149
по социальному страхованию и обеспечению	634	37	40
по оплате труда	635	258	88
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	51	9
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	19	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**2 417**	**1 269**
БАЛАНС	**700**	**7 922**	**9 173**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2014 года	За январь–декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	25 229	23 339
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(19 288)	(17 164)
Валовая прибыль (010-020)	030	5 941	6 175
Управленческие расходы	040	(1 161)	(801)
Расходы на реализацию	050	(4 002)	(3 073)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	778	2 301
Прочие доходы по текущей деятельности	070	32	1 937
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(122)	(3 769)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	688	469
Доходы по инвестиционной деятельности	100	976	107
в том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	3	89
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	970	9
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	3	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(3)	(23)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111		(55)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(3)	-
Доходы по финансовой деятельности	120	10	513
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121		
прочие доходы по финансовой деятельности	122	10	513
Расходы по финансовой деятельности	130	-	-
в том числе:			
проценты к уплате	131		-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132		
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	983	597
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	1 671	1 066
Налог на прибыль	160	(146)	(139)
Изменение отложенных налоговых активов	170		-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (±150-160± 170±180-190-200)	210	1 525	927
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	(624)
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	1 525	303
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель **И.А.Полуян**

Главный бухгалтер **А.М.Петрушенко**

Дивиденды за 2014 год утверждены в размере 2100 бел. руб. на одну акцию. Выплату дивидендов за 2014 год произвести в сроки с 1 апреля 2015 по 31 мая 2015 включительно.

Управляющий ООО «ПрофДМ» проводит торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ДУП «ПМК-199» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690018982), а именно:

№	Описание	Начальная цена, бел. руб.
1	Здание гаражей, инв. № 610/С-42819, общ. пл. 682 кв.м и земельный участок площадью 0,6863 га, расположенные по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская, д. 16.	716 294 000
2	Здание гаража, общ. пл. 59,8 кв. м. и условный земельный участок, расположенные по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская, д. 7.	69 403 000
3	Ограждение территории железобетонное, инв. № 30 (недвижимое улучшение), расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская, д. 7	40 807 000

Аукцион состоится 04.05.2015 г. в 11.00 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, д. Углы, ул. Октябрьская, д. 5. Заявки на участие в аукционе принимаются с 01.04.2015 по 30.04.2015 г.

Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества должника, выставляемого на торги. *Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с № 3012401820017 в РКЦ 21 в филиале ОАО «Белагропромбанк» г. Борисова, код 942, УНП 690018982.*

По вопросу участия в аукционе, ознакомления с предметами торгов, а также по всем иным интересующим вопросам, связанным с проведением торгов, обращаться **по тел. +375 (17) 395-81-34; +375 (29) 698-51-76.**

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 2014 ГОД

Открытое акционерное общество

«Витебскхлебпром»

Местонахождение:
210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5,
Телефон: 8(0212) 37-02-57
Доля государства в уставном фонде эмитента:
республиканская – 276 792 – 99,95%,
областная – 144 – 0,05%
Дивиденды за отчетный период не начислялись и не выплачивались.
Обеспеченность акции имуществом общества, в тыс. руб. – 1 309,66
Дата проведения годового собрания акционеров, на котором утвержден годовой бухгалтерский баланс: 26.03.2015 г.

Организация: ОАО «Витебскхлебпром»
Учетный номер плательщика: 300031823
Вид экономической деятельности:
Производство хлебобулочных и кондитерских изделий
Организационно-правовая форма: Акционерное общество
Орган управления: Общее собрание акционеров
Единица измерения: млн. рублей
Адрес: 210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31.12.2014 года	На 31.12.2013 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	380 330	399 943
Нематериальные активы	120	58	33
Доходные вложения в материальные активы	130	168	176
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	151	154
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133	17	22
Вложения в долгосрочные активы	140	8 859	3 393
Долгосрочные финансовые вложения	150	23	23
Отложенные налоговые активы	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	2	7
Прочие долгосрочные активы	180	195	240
ИТОГО по разделу I	**190**	**389 635**	**403 815**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	100 753	88 617
В том числе:			
материалы	211	65 605	61 190
животные на выращивании и откорме	212	8 821	7 855
незавершенное производство	213	12 556	8 980
готовая продукция и товары	214	13 771	10 592
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230	5 266	4 338
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	5 434	6 106
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	46 599	35 991
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	2 802	4 087
Прочие краткосрочные активы	280	353 369	306 941
ИТОГО по разделу II	**290**	**514 223**	**446 080**
БАЛАНС	**300**	**903 858**	**849 895**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код строки**	**На 31.12.2014 года**	**На 31.12.2013 года**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	276 936	276 792
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		
Резервный капитал	440		
Добавочный капитал	450	33 770	35 685
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	51 987	26 643
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		
Целевое финансирование	480		
ИТОГО по разделу III	**490**	**362 693**	**339 120**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	34 216	46 017
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	7 938	8 479
Отложенные налоговые обязательства	530		
Доходы будущих периодов	540	52	53
Резервы предстоящих платежей	550		
Прочие долгосрочные обязательства	560	3 190	3 918
ИТОГО по разделу IV	590	45 396	58 467
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	26 772	21 248
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	22 096	30 012
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	93 607	94 046
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	70 210	68 264
по авансам полученным	632	995	2 621
по налогам и сборам	633	4 181	4 432
по социальному страхованию и обеспечению	634	3 289	2 853
по оплате труда	635	10 157	9 929
по лизинговым платежам	636	158	478
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637		1 791
прочим кредиторам	638	4 617	3 678
Обязательства, предназначенные для реализации	640		
Доходы будущих периодов	650	62	4
Резервы предстоящих платежей	660		
Прочие краткосрочные обязательства	670	353 232	306 998
ИТОГО по разделу V	**690**	**495 769**	**452 308**
БАЛАНС	**700**	**903 858**	**849 895**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2014 года

Наименование показателя	Код строки	За январь-декабрь 2014 г.	За январь-декабрь 2013 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	10	717 253	625 562
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	20	(478 219)	(419 358)
Валовая прибыль (010 – 020)	30	239 034	206 204
Управленческие расходы	40	(53 914)	(54 343)
Расходы на реализацию	50	(112 726)	(95 579)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	60	72 394	56 282
Прочие доходы по текущей деятельности	70	22 679	22 183
Прочие расходы по текущей деятельности	80	(45 165)	(38 412)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	90	49 908	40 053
Доходы по инвестиционной деятельности	100	566	880
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	172	466
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102		
проценты к получению	103	3	192
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	391	222
Расходы по инвестиционной деятельности	110	722	4 864
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	544	4 620
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	178	244
Доходы по финансовой деятельности	120	440	782
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	401	259
прочие доходы по финансовой деятельности	122	39	523
Расходы по финансовой деятельности	130	(14 812)	(12 938)
В том числе:			
проценты к уплате	131	13 749	12 164
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	942	366
прочие расходы по финансовой деятельности	133	121	408
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 – 110 + 120 – 130)	140	(14 528)	(16 140)
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	35 380	23 913
Налог на прибыль	160	(9 805)	(7 337)
Изменение отложенных налоговых активов	170		
Изменение отложенных налоговых обязательств	180		
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190		(30)
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(10)	(26)
Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 –190-200)	210	25 565	16 520
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		62 352
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230		
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	25 565	78 872
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250		
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260		
Количество организаций получивших прибыль по конечному финансовому результату	270	1	1
Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату	270а	25 565	16 520
Количество организаций получивших убыток по конечному финансовому результату	280		
Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату	280а		

Расшифровка прочих доходов и расходов по текущей деятельности

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период прошлого года	
Наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Доходы, связанные с государственной поддержкой, направленной на приобретение запасов, оплату выполненных работ, оказанных услуг, финансирование текущих расходов (из строки 070)	300	1 952	X	1 930	X
Выплаты компенсирующего, стимулирующего характера, а также выплаты, носящие характер социальных льгот (из строки 080)	310	X	10 630	X	7 472
Справочно:	2	3		4	
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг (с учетом налогов и сборов включаемых в выручку)	400	793 663		698 896	
в том числе: выручка полученная в иностранной валюте	400а	22 646		20 003	
Рентабельность продаж, %	410	9,12		8,05	

Отдельные финансовые результаты

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	миллионов рублей	717 253	625 562
Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	миллионов рублей	644 859	569 280
Прибыль (убыток) до налогообложения, всего	миллионов рублей	35 380	23 913
в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	миллионов рублей	72 394	56 282
в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности	миллионов рублей	-22 486	-16 229
в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	миллионов рублей	-14 528	-16 140
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	миллионов рублей	9 815	7 393
Чистая прибыль (убыток)	миллионов рублей	25 565	16 520
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	миллионов рублей	51 987	26 643
Долгосрочная дебиторская задолженность	миллионов рублей	2	7
Долгосрочные обязательства	миллионов рублей	45 396	58 467
Среднесписочная численность работающих	человек	2 701	2 750

Согласно аудиторскому заключению от 24.03.2015 №92 аудиторской организации ООО «Белросаудит» (зарегистрированы в ЕГР за № 600506719 решением Мингорисполкома от 28.04.2000 г. 3465), отчетность ОАО «Витебскхлебпром» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение, финансовые результаты деятельности, включая изменения финансового положения (движения денежных средств) в соответствии с применимой основой составления и предоставления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

■ Разам з намі

ВЯРТАННЕ СТАРАЖЫТНАГА ВАДАЛІВА

Пра гэта ў свой час паклапаціўся Аляксей Карпюк

У Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі да 95-годдзя з дня нараджэння Аляксея Карпюка падрыхтавалі цікавую выставу. Яна расказвае не толькі пра жыццё, творчы шлях пісьменніка, грамадскага дзеяча, але і пра яго — як музейшчыка. Так супрацоўнікі ўшанавалі памяць першага дырэктара свайго музея.

— Хочацца падзякаваць Валянціне Аляксееўне, дачцэ Аляксея Нічыпаравіча, якая не толькі дала нам у часовае карыстанне фатаграфіі, рэчы, дакументы свайго бацькі, але і падаравала частку яго архіва, — кажа вядучы навуковы супрацоўнік музея Людміла Русецкая і прапануе азнаёміцца з экспазіцыяй.

Вось, напрыклад, фатаграфія, дзе Аляксей Карпюк — навучэнец педагагічнага тэхнікума ў Навагрудку. Побач з ім — Уладзімір Калеснік. Два будучыя выдатныя пісьменнікі.

Уладзімір Калеснік узгадваў, што навучэнцы часта прывозілі з дому сідр — дамашняе віно. А Карпюк два разы на год, пасля летніх і зімовых канікул валачыў з дому цэлую гару смакаты — кумпяк, паляндвіцы, каўбасы. Напоямі з «вялікімі градусамі» ён і тады, і пазней не захапляўся. Аляксей Нічыпаравіч хацеў нават стварыць таварыства непітушчых і прапаноўваў гэтую ідэю Алесю Адамовічу. Той з гумарам адказаў: «Я ўступлю ў тваё таварыства, толькі разламаю яго знутры».

Выстава паказвае таксама кніжку чырвонаармейца Карпюка, яго інвалідную кніжку. Але пазней Аляксей Нічыпаравіч адмовіўся ад атрымання грошай па інваліднасці, бо лічыў, пэўна, што нейкія льготы яму не патрэбны.

Сярод іншых экспанатаў — нямецкая пішучая машынка Аляксея Карпюка (ён не любіў пісаць ручкай), яго губны гармонік. А гэта — Біблія, якая ляжала на рабочым стале дырэктара Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі. Можна ўбачыць, што ён рабіў там алоўкам пометкі.

Аляксей Карпюк быў кіраўнікомузейшчыкам крыху больш за 5 гадоў. За гэты час, як кажа Людміла Русецкая, у музей паступіла больш за 6 тысяч экспанатаў, былі закладзены асновы ўсіх сённяшніх калекцый. Гэта і абразы, і старажытныя вырабы з тканіны, металу, дрэва, і старадрукі... Іх знаходзілі падчас пошукавых экспедыцый у розных рэгіёнах Беларусі, набывалі ў прыватных калекцыянераў, яшчэ пры Карпюку зарадзілася і традыцыя перадачы музею культавых прадметаў, што затрымліваюцца мытнікамі на мяжы.

Найбольшую цікавасць з усіх экспанатаў, якімі папоўніўся музей падчас дырэктарства Аляксея Карпюка, выклікае так званы акваманіл (вадаліў) пачатку XIII стагоддзя — сярэдневяковы посуд для вады. Першапачаткова ён (у выглядзе фігуры чалавека альбо жывёлы) служыў для абмывання рук святара падчас набажэнства. А пазней ператварыўся ў прадмет паўсядзённага бытавога ўжытку на землях усходніх славян.

Аляксей Нічыпаравіч хацеў нават стварыць таварыства непітушчых і прапаноўваў гэтую ідэю Алесю Адамовічу. Той з гумарам адказаў: «Я ўступлю ў тваё таварыства, толькі разламаю яго знутры».

На рабочым стале дырэктара Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі была Біблія.

— Ён трапіў у музей дзякуючы Аляксею Карпюку. Былі дакументы, якія сведчылі пра тое, што гэты бронзавы вадаліў першапачаткова знаходзіўся ў нашай Барысаглебскай (Каложскай) царкве, а потым пасля розных перыпетый апынуўся ў адным з музеяў Вільнюса. І Аляксею Нічыпаравічу ўдалося вярнуць адтуль гэты рарытэт у Гродна. Мяркую, што калі б Карпюк набыў толькі яго і больш нічога, то ўжо ўвайшоў бы ў гісторыю музея.

— Можа, наконт перадачы вадаліва было адпаведнае ўказанне з Масквы?

— На маю думку, у тых рэаліях уплыў аказала тое, што Аляксей Нічыпаравіч умеў размаўляць з людзьмі, дамаўляцца.

— Якім ён застаўся ў памяці музейных старажылаў?

— Усе кажуць, што ён успрымаўся як родны бацька. Пра кожнага клапаціўся. Камусьці дапамог атрымаць кватэру. Альбо мог сказаць: «Збірайцеся, паедзем у лес на «дзень ландыша». Селі калектывам у аўтобус і паехалі. Вось, дарэчы, «лясная» фатаграфія, дзе Карпюк са сваім легендарным кіем, што цяпер паказваем на выставе. Асабіста я не ўяўляю сабе вуліцу Ажэшкі 1970-х гадоў без Аляксея Нічыпаравіча і яго кія, з якім той рашуча крочыў па жыцці.

Дарэчы, Аляксей Карпюк прычыніўся да лёсу вядомага мастака-рэстаўратара Уладзіміра Кіслага. Вось што ён расказаў пра абставіны свайго працаўладкавання:

— 1979 год. Заходжу ў музей, дзе дырэктарам высокі мужчына — такога каўбойскага, вэстэрнаўскага выгляду, як у галівудскіх фільмах. Кажу, хто я такі, што хачу працаваць у музеі. Вакансій, на жаль, няма. «Але ты да нас заходзь», — абнадзеіў Аляксей Нічыпаравіч. У той час я быў знаёмы з беларускімі пісьменнікамі. Уладзімір Дамашэвіч пазнаёміў мяне з Уладзімірам Караткевічам. Расказаў ім пра жаданне працаваць у музеі, і яны перадалі мне ліст да Карпюка. Канверт я не адкрываў, але відавочна, што гэта была нейкая пратэкцыя. Неўзабаве я зноў прыйшоў да Аляксея Нічыпаравіча. Ён прачытаў ліст, паклаў яго ў шуфляду і сказаў: «Так, хлопец, ты нам панравіўсо (ён так «сокаў» і «сакаў», як на Беласточчыне, яго малой радзіме гавораць), пакінь свае каардынаты. І як будзе месца — мы цябе знойдзем». Так і сталася.

Старажытны вадаліў, які вярнуўся ў Гродна дзякуючы Аляксею Карпюку.

Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

Дзеля сваёй мары Уладзімір Кіслы ахвяраваў нашмат большай зарплатай мастака-карэктара ў праектным інстытуце і прыйшоў на работу ў музей.

Вось якім яму запомніўся Аляксей Карпюк як чалавек і дырэктар музея:

— Цяжка было зразумець, калі Аляксей Нічыпаравіч жартуе, а калі гаворыць сур'ёзна. Але чалавек ён быў высокаморальны. Страшна не любіў выпівох — лічыў гэта найгоршай заганай. Але, разам з тым, мог сабраць застолле, якое не перарастала ў п'янку. Не любіў бюракратызму, «правакаваў» творчыя адносіны да любой работы. Менавіта Карпюк зрушыў з месца рэстаўрацыю будынкаў базыліянскага манастыра, што музей атрымаў у вельмі занядбаным стане. Напрыклад раздабыў медзь, якой пакрылі манастырскія купалы.

Наўрад ці Аляксея Карпюка папрасілі «зверху» пакінуць пасаду дырэктара музея. Уладзімір Кіслы мяркуе, што гэта было чыста асабістае пытанне:

— Ён усё ж быў найперш пісьменнік. І, падрыхтаваўшы гэтую музейную «глебу», калі «механізм» быў ужо запушчаны, вырашыў, пэўна, засяродзіцца на літаратурнай працы.

Але для будучыні застаецца не толькі напісанае...

Барыс ПРАКОПЧЫК

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Марына ЯЎСЕЙЧЫК

ПРЫСУД БАЛОТНЫХ ЯЛІН

Апавяданне, якое прапанавала на конкурс «Звязды» Марына Яўсейчык, патрабуе ўдумлівага чытання. Ёсць у ім свае сімвалы, пэўная прывязка да вядомых літаратурных твораў (ужо сама назва — «Прысуд Балотных Ялін» — прымушае згадаць аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха»), ёсць спалучэнне рэальнага і містычнага. Ці, можа, за містыкай хаваюцца чалавечыя фобіі? А ўвогуле, асабіста мяне гэтае апавяданне падштурхнула да думкі, што, магчыма, з часам у асобе Марыны беларуская літаратура будзе мець майстра інтэлектуальнай прозы, якой пакуль у нас яшчэ вельмі мала.

Алесь БАДАК.

СОНЕЧНАЯ далячынь стала халоднай. Туман прабіўся праз заслону, якую трымаў на сабе роў з вадою. Там утварылася пойма. Для сабак і катоў. Для гарадскіх сабак і катоў. І сонечная далячынь стала халоднай. Яна імкнецца. Да ўсевалодання прасторай. Каб зрабіць з яе адвечны холад і голад. Туман лезе ў вокны, развесіў у кватэрах фіранкі з хмараў.

За сталом сядзіць дзяўчына. Яна глядзіць на ўсё гэта і думае: «Як дзіўна. А на полі спее гарох». За сталом сядзіць хлопец і думае зусім пра іншае: «Як правільна гэта. Міннае поле праходзяць толькі бессмяротныя. У свой час». Дзяўчына ўспомніла: «Пахне чабор». І, заплюшчыўшы вочы, уцягнула носам фіранкі-хмары, якія павесіў туман. Ёй раптам зрабілася холадна-холадна. Ёй раптам зрабілася балюча-балюча. Дрыжыкі пайшлі па ўсім целе. Скура стала «гусінай». Па нагах паплыло свежае паветра з адчыненага балкона. Дзяўчына павалілася на канапу і стала слухаць тахканне свайго сэрца. Канапа стаіць побач са сталом. На выпадак, калі нехта страціць прытомнасць, але не захоча канаць. Канапа стаіць тут для адпачынку. Калі б хлопец, які сядзіць за такім жа сталом, толькі ў іншай кватэры, што насупраць, пабачыў бы гэтае здарэнне, ён бы падумаў: «Нешта незвычайнае адбываецца ў свеце, дзе многа святла сярод цемры». Ён бы ўспомніў пра міннае поле і сказаў: «Ёсць у цэнтры горада музей вайны. Там няма канап. Людзі, мусіць, прызвычаіліся жыць сярод вайны і ў мірны час. Прызвычаіліся стаяць і стоячы памяраць».

ГАРАДСКІЯ туманы з'яўляюцца нечакана. У той самы момант, калі сонца бярэ пачатак дня. У той самы момант, калі птушкі пачынаюць размаўляць з вясною, будзіць гараджан. Птушкі не падымаюць вэрхал. Яны паасобку адна ад другой. То тут, то там. Птушкі ведаюць пра туман, які не бачаць людзі. Птушкі кідаюць у вокны гараджан свой кліч быць асцярожнымі і не спаць. Калі такою раніцаю хтосьці будзе ляжаць з заплюшчанымі вачыма, туман здзейсніць прысуд Балотных Ялін. Туман звядзе са свету. І хлопца, і дзяўчыну. Туман задушыць іх у мірны, самы светлы час. Калі сонца ў небе.

«Чаму роў не ўтрымаў на сабе заслону? І хто такая Элачка-Людажэрка? Чаму туман не патануў у пойме? І хто такі Магутны і Жудасны Волат? Навошта туману вешаць фіранкі на вокнах? І хто такія ўсе гэтыя людзі з другога фронту, якімі кіруе кабета, чыё імя пачынаецца на літару А? Навошта тады ўвогуле зараджалася сонечная далячынь? І што яны хочуць сказаць нам, тыя, іншыя, не падобныя да звычайных людзей, але падобныя да цёмных вершнікаў? Які сэнс мае гульня з іншасветам?» — так пытаецца ў сябе самой дзяўчына, якая ляжыць на канапе. Яе душа вызвалілася і пачала шукаць зачэпкі да жыцця. Яны нібыта прышчэпкі для бялізны, выдаюць сябе яркім колерам. І душа знайшла! Акенца ў жыццё, да якога пакуль не дацягнуліся рукі злачынцаў, якія хочуць забіць дзяўчыну. Прастора адкрыла ёй таямніцу. Дзяўчына пра ўсё даведалася і вырашыла не паміраць.

«Мемарыяльны комплекс пабудаваны мёртвымі для жывых, якія толькі рыхтуюцца мерцвякамі стаць. Мусіць, хтосьці штурхае іх на такі ўчынак», — адказаў неўпапад хлопец дзяўчыне. «Мярзотнікі!» — ён пракрычаў ва ўвесь голас, што было моцы.

Дзяўчына пачула голас хлопца з суседняй кватэры, які рэхам уляцеў у шчыліну адчыненага балкона. У гэтую самую шчыліну прабіліся і свежыя кіпцюры паветра. Яны пачалі звязваць дзяўчыне ногі. Але раптоўна кіпцюры спыніліся. Наваколле сціхла. Тыя, іншыя, пра каго распытвала сама ў сябе дзяўчына, разгубіліся, яны стаялі моўчкі з выцягнутымі чорнымі рукамі.

ЛЮДЗІ з другога фронту былі шаманамі. Звар'яцелымі. Спустошанымі. Галоднымі. Злымі. Ім хацелася маладой крыві. Не выпіць — пасмактаць толькі. Каб наталенне смагі прынесла ім задавальненне. Яны не чакалі, што нехта з людзей прачнецца і агучыць свой пратэст. Таксама яны не чакалі, што хтосьці даведаецца іх сапраўдныя імёны, якія яны і самі не ведалі.

Туман пайшоў прэч. Ён павярнуў назад. Забраў з сабою кіпцюры, якія трымалі дзяўчыне ногі. Зачыніў за сабой балкон. Туман утапіўся ў пойме, што разляглася сваім правым вільготным бокам. Пойма дачакалася, пакуль зноў аб'явіцца сонца, і сама стала знікаць у нетрах зямлі. Ад яе засталіся толькі гукі: «чвяк-чвяк».

Сабакі і каты. Яны перасталі катаваць сваіх гаспадароў паходамі да вады. Гарадскія сабакі і каты пачалі вычышчацца і вымывацца. Яны вырашылі, што хадзіць да поймы, якая толькі і здольная да таго, што выдыхаць перадсмяротныя гукі, — гэта небяспечна. У небяспецы многа бруду, невядомасці і цемры.

«Хаў!» — выдыхнула пойма. На яе месцы расцвілі коцікі. Яны не падобныя да гарадскіх сабак і катоў. Да вясковых таксама не падобныя. Коцікі на лазе. Галінкамі гэтага дрэва бацькі б'юць дзяцей, каб тыя не шкодзілі. «А што сталася з тымі, з іншымі?» — спыталася дзяўчына. «Яны памерлі», — адказаў хлопец з суседняй кватэры. «Яны памерлі гэтак жа нечакана, як нечакана даведаліся свае сапраўдныя імёны, якія ад нараджэння былі схаваныя цемраю».

МЯРЗОТНІКАЎ не стала. Сонечная далячынь прагрэлася. Яна адчула гарачыню надыходзячага лета. На календары яно будзе мець пачатак яшчэ не хутка, але ў душы чалавека расцвілі пявоні першых дзён чэрвеня.

■ Краіна на смак

БЕЗ ЧАГО НЕЛЬГА ЗРАЗУМЕЦЬ НАРОД,

Кухар у Грузіі ці не самая паважаная прафесія.

або Чаму шашлыкі — кропля ў моры грузінскіх далікатэсаў

Грузія — краіна, у якой гасціннасць — неад'емная рыса характару амаль кожнага жыхара, а святочнае застолле, — найважнейшы складнік нацыянальнай культуры. Стравы грузінскай кухні — такая ж візітоўка краіны, як і старажытныя манастыры і цэрквы, горныя пейзажы і віно. Пасля падарожжа па гэтай краіне я паспрабавала скласці спіс страў, якія дапамогуць падарожніку адчуць Грузію, што называецца, на смак.

Адразу скажу: гэта краіна цікавая ўжо тым, што ў кавярнях і рэстаранах звычайных для нас еўрапейскіх страў не так ужо і шмат. Як гэта ні банальна гучыць, у Грузіі акцэнт робіцца менавіта на нацыянальнай кухні, а не на італьянскай, японскай, кітайскай ці яшчэ якой-небудзь. Тут і без гэтага кожны прыхільнік пэўных відаў страў — з мяса, з зеляніны і агародніны, з малочных прадуктаў або з грыбоў — знойдзе тое, што прыйдзецца яму даспадобы. Кухня гэтай краіны вельмі разнастайная.

У большасці пры згадцы аб грузінскай кухні першымі ў галаву прыходзяць шашлыкі. Грузіны ж з гэтай прычыны нават трошкі крыўдзяцца: маўляў, шашлыкі — гэта кропля ў моры гастранамічных далікатэсаў. Раскажу пра асноўныя з іх.

БЕЗ МАЛАКА — НЕ ГРУЗІЯ

Па-першае, для грузінскай кухні характэрна вялікая колькасць страў, прыгатаваных з малака і малочных прадуктаў. Так, у гэтай краіне традыцыйна вырабляецца шмат розных відаў сыроў. Самыя вядомыя: плецены аджарскі, сулугуні, імерулі. Без іх не абыходзіцца ніякае застолле.

Барана — каларыйная страва на аснове масла і аджарскага сыру. Як і многія стравы грузінскай кухні, барана мае шмат рэцэптаў прыгатавання — у залежнасці ад рэгіёна або традыцый асобнай сям'і. Самым жа папулярным спосабам прыгатавання з'яўляецца рэцэпт, куды, акрамя масла і сыру, уваходзяць яйкі і кукурузная мука. Барана падаецца на стол гарачай, у маслянай падліўцы плаваюць кавалачкі цеста, прыгатаванага з яйка, сыру і мукі.

Асобна трэба сказаць пра **мацоні —** у нейкім сэнсе, гэта грузінскі аналаг кефіру. Рыхтуюць мацоні з гатаванага малака, у якое дабаўляюць спецыяльную закваску. У выніку атрымліваецца густая маса, што выглядам нагадвае смятану, дзе плаваюць кавалачкі сыру. Мацоні можна ўжываць як асобную страву, а можна выкарыстоўваць як інгрэдыент для іншых. Так, з яго лёгка прыгатаваць смачны і карысны дэсерт — трэба проста паліць мацоні вадкім мёдам або варэннем.

ЗАМЕСТ ПІЦЫ — ХАЧАПУРЫ

На аснове мацоні робяцца некаторыя віды **хачапуры —** яшчэ адной вядомай грузінскай стравы, без якой там немагчыма ніводнае застолле. Што ў Італіі піца, тое ў Грузіі — хачапуры. У кожнага рэгіёна ёсць свая тэхналогія прыгатавання гэтай стравы. Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца імерулі хачапуры (ад назвы аднаго з рэгіёнаў Грузіі — Імярэціі), якое ўяўляе з сябе тонкі слой цеста з сырнай начынкай. У некаторых рэцэптах прыгатавання гэтай стравы рэкамендуюць пасыпаць хачапуры сырам яшчэ і зверху.

Асобна трэба сказаць пра **аджарскае хачапуры —** ад традыцыйнага яно адрозніваецца формай у выглядзе лодачкі і смакам. Калі звычайнае хачапуры падаюцца разам з іншымі закускамі, то аджарскае — як асобная страва. У Аджарыі — рэгіёне Грузіі, які знаходзіцца на беразе Чорнага мора — упэўнены: яшчэ ні ў аднаго народа не атрымалася так «смачна» аб'яднаць «сонца» (яечны жаўток), з «морам» (растопленым маслам і сырам, у якім яно плавае). Такую страву ядуць рукамі — адрываюць кавалачкі «цеста-лодачкі» і мачаюць іх у яечна-сырнае «мора».

Хінкалі часта бываюць адзінай стравай святочнага стала.



Хачапуры па-аджарску — адзін з самых прыгожых і смачных відаў гэтай стравы.

Яшчэ адной традыцыйнай мучной стравай грузінскай кухні з'яўляецца **мчадзі —** прыгатаваныя з кукурузнай мукі аладкі, якія падаюцца як дапаўненне да сыроў і страў з агародніны і зеляніны.

АДНА ЗАКУСКА — 200 ВАРЫЯЦЫЙ

Агародніна і зеляніна ў Грузіі — неад'емная частка большасці страў. Без іх, як і без малочных прадуктаў і хачапуры, нельга ўявіць сабе грузінскае застолле. Розныя салаты — з перцам, памідорамі, баклажанамі, агуркамі, кіндзой, лобія (агульная назва ў Грузіі для фасолі) — карыстаюцца ў грузін вялікай папулярнасцю.

Пхалі — адна з самых вядомых і танных страў грузінскай кухні. Гэта традыцыйная закуска, падчас прыгатавання якой прытрымліваюцца прынцыпу варыянтнасці («адзін рэцэпт — розныя інгрэдыенты»). Асновай пхалі можа стаць любая агародніна або зеляніна і нават трава (тая ж крапіва), а таксама мяса, рыба. Галоўны інгрэдыент дробна рэжацца, адварваецца, прыпускаецца, бланшыруецца або пакідаецца без цеплавой апрацоўкі (напрыклад, травы, некаторыя віды гародніны). Запраўляецца пхалі рэзкім соусам, выраблены з грэцкіх арэхаў, вострага перцу, часнаку, кінзы, рэпчатай цыбулі, хмелі-сунелі, солі і віннага воцату. У рэгіёне Гурыя пхалі гатуюць з рысам. Падаецца страва таксама ў арыгінальным выглядзе: гэта могуць быць невялікія калабкі — са шпінату, лобія, морквы, або каўбаскі (напрыклад з баклажанаў з арэхавай начынкай). Усяго вядома больш за дзвесце варыянтаў прыгатавання пхалі.

Чурчхела — дэсерт, без якога складана ўявіць Грузію.

Пхалі — адна з самых папулярных закусак у Грузіі.

ЯШЧЭ АДНА АДМЕТНАЯ РЫСА КРАІНЫ

Што да дэсертаў, то адным з самых папулярных у Грузіі салодкіх пачастункаў з'яўляецца **чурчхела.** Столікі ўздоўж дарогі, на якіх для продажу раскладзены розна каляровыя салодкія «каўбаскі» — адметная рыса ці не кожнай грузінскай вёскі. Чурчхела гатуецца з загушчанага кукурузнай мукой вінаграднага соку і розных арэхаў. Арэхі нанізваюцца на нітку — так фарміруецца аснова грузінскага далікатэсу. Потым яна апускаецца ў прыгатаваны па спецыяльным рэцэпце кісель з вінаграднага соку, які называецца пеламушы. Пасля чурчхела сушыцца — і дэсерт гатовы! Ён, дарэчы, можа захоўвацца не адзін месяц.

ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПРА НОЖ І ВІДЭЛЕЦ

Яшчэ адной культавай стравай у Грузіі лічыцца **хінкалі —** вялікія і сакавітыя пельмені з «хвосцікам». Хінкалі ядуць рукамі — трымаць іх трэба за той самы хвосцік. Калі ж вы паспрабуеце «расправіцца» з такой стравай пры дапамозе нажа і відэльца, то смак выцеча разам з сокам, без якога, упэўнены грузіны, хінкалі перастае быць хінкалі.

Часта іх падаюць як асноўную і нават адзіную страву да стала, і такі баль у народзе называюць «хінклааба» — «свята хінкалі». Сёння патрабаванні да начынкі «грузінскіх пельменяў» не такія строгія, як у даўніну (раней іх начынялі толькі баранінай або казляцінай), але некаторых нюансаў прыгатавання гэтай стравы ўсё ж імкнуцца прытрымлівацца. У прыватнасці, гаспадыні, якая гатуе хінкалі, вельмі важна навучыцца рабіць на кожным такім пельмені як мага больш складачак: чым іх больш, тым вышэйшым лічыцца майстэрства кухара. Такіх складачак павінна быць хаця б 20.

ЦІ СКЛАДАНА АДКРЫЦЬ КАВЯРНЮ Ў ГРУЗІІ?

Кавярні і рэстараны ў Грузіі сустракаюцца літаральна на кожным кроку. Як аказалася, у гэтай краіне адчыніць пункт грамадскага харчавання нескладана і абыдзецца дастаткова танна. **Супрацоўнік аднаго з рэстаранаў у Тбілісі Георгій МАРГІЛАШВІЛІ** расказаў, што зарэгістраваць свае кавярню або рэстаран можна ў любым аддзяленні Дома юстыцыі (дзяржаўнай установе Грузіі, асаблівасць якой заключаецца ў канцэнтрацыі шэрагу дзяржаўных паслуг у адным будынку).

— Гэта абсалютна нескладана і нядорага, — паведаміў Георгій. — Чалавек становіцца на ўлік для таго, каб зарэгістраваць сваё прадпрыемства, якое будзе лічыцца ў нас прадпрыемствам малога бізнесу. Натуральна, ёсць спецыяльная працэдура, але яна цягнецца ўсяго некалькі дзён. Неабходна, каб быў касавы апарат, а ў штаце будучага прадпрыемства грамадскага харчавання меўся бухгалтар.

Дзяржава дапамагае развіццю малога бізнесу льготнымі пазыкамі. Для таго, каб атрымаць яе, прадпрымальнік павінен прадставіць рэальны, арыентаваны на прыбытак бізнес-праект. Потым банкі, пад адказнасць Нацыянальнага банка Грузіі — гэта менавіта яго праект, даюць нізкапрацэнтныя пазыкі пачынаючым бізнесменам. У астатнім — чым большай папулярнасцю карыстаецца кавярня, чым большую колькасць людзей уласнік можа забяспечыць рабочымі месцамі, тым на большую дапамогу ён можа разлічваць ад дзяржавы.

Як заўважае ў сваю чаргу **Марыка БАГВЕРАДЗЕ, супрацоўнік Нацыянальнага агенцтва па турызме Грузіі,** рэстаранны бізнес у гэтай краіне, як правіла, прыбытковы.

— Рознага кшталту кавярні ў нас карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Іх шмат і ля дарог, і ў населеных пунктах — як вялікіх, так і не вельмі. Грузіны любяць застоллі, ім падабаецца павесяліцца ў кавярні, што ўжо казаць пра рэстараны.

Што да санітарнага кантролю, то перыядычна адпаведныя службы наведваюцца на прадпрыемства грамадскага харчавання без папярэджання. Прадстаўнік гэтай службы можа зайсці ў любую гандлёвую палатку, супермаркет, магазін, кавярню, рэстаран, набыць што-небудзь як звычайны пакупнік, а пасля правесці экспертызу. Гэта робіцца для таго, каб уладальнік таго ці іншага пункта, дзе прадаюцца прадукты харчавання, заўсёды кантраляваў іх якасць. У адваротным выпадку гэта пагражае вялікімі штрафамі, а калі будзе зафіксавана паўторнае парушэнне, то магчыма і канфіскацыя.

— Але нашмат больш дзейсным сродкам з'яўляецца тое, што Грузія — невялікая краіна, — упэўнена Марыка Багверадзе, — і чуткі пра ненадзейны магазін, кавярню або рэстаран хутка разыходзяцца. Адпаведна, і людзі не будуць наведваць гэтыя месцы.

Надзея ЮШКЕВІЧ

СТРАХ ЭКСПЕРТ ГРУПП
страховой брокер

ООО «СтрахЭкспертГрупп»
Республика Беларусь, 220012, г. Минск,
ул. Сурганова, 27; офис 2
Тел./факс: (+37517) 202 00 84, 202 00 87
E-mail: info@belbroker.by, http://www.belbroker.by
Расчетный счет (BYR) 3012 202 570 010
• Валютный счет (USD) 3012 202 575 015
Ф-л 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск,
код 153001720. УНП 101251041. ОКПО 37484932

ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗА 2014 ГОД

в миллионах белорусских рублей

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4	1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ				**III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
Основные средства	110	855	799	Уставный капитал	410	352	7
Нематериальные активы	120	-	-	Резервный капитал	440	33	30
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-	Добавочный капитал	450	914	850
Прочие долгосрочные активы	180	-	-	Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	108	185
ИТОГО по разделу I	**190**	**855**	**799**	**ИТОГО по разделу III**	**490**	**1 407**	**1 072**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ				**IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
Запасы	210	19	21	**ИТОГО по разделу IV**	**590**	**-**	**-**
В том числе: материалы	211	19	21	**V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
Расходы будущих периодов	230	5	5	Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	233	180	Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-	Краткосрочная кредиторская задолженность	630	163	129
Денежные средства и их эквиваленты	270	526	342	В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	5	1
Прочие краткосрочные активы	280	-	-	по авансам полученным	632	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**783**	**548**	по налогам и сборам	633	24	20
БАЛАНС	**300**	**1 638**	**1 347**	по социальному страхованию и обеспечению	634	68	56
				по оплате труда	635	60	50
				прочим кредиторам	638	6	2
				Обязательства, предназначенные для реализации	640	68	146
				ИТОГО по разделу V	**690**	**231**	**275**
				БАЛАНС	**700**	**1 638**	**1 347**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

в миллионах белорусских рублей

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2014 года	За январь–декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	1 679	1 428
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(1 300)	(1 078)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	379	350
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	379	350
Прочие доходы по текущей деятельности	070	1	1
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(39)	(29)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	341	322
Доходы по инвестиционной деятельности	100	71	92
В том числе: проценты к получению	103	71	92
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	134	252
В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	134	252
Расходы по финансовой деятельности	130	(110)	(249)
В том числе: проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(108)	(249)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(2)	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	95	95
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	436	417
Налог на прибыль	160	(86)	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	(46)
Чистая прибыль(убыток)(± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200)	210	350	371
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемых в чистую прибыль (убыток)	220	65	143
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	415	514

Руководитель А.В. Данильчик Главный бухгалтер М.Б. Шорец

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ №04 от 05.03.2015 г.

Аудиторская организация: ООО «Аудиторско-консалтинговая служба «АУДИКС»
Местонахождение: 220028, г. Минск, ул. Козыревская, 15, ком. 804, тел.: 226-96-22.

Свидетельство о государственной регистрации №100021951 от 16 июля 2001 г., выданное Минскими городским исполнительным комитетом.

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения. По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ООО «СтрахЭкспертГрупп», подготовленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «СтрахЭкспертГрупп» на 31 декабря 2014 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ООО «СтрахЭкспертГрупп» за год, закончившийся на указанную дату.

Директор ООО «Аудиторско-консалтинговая служба «АУДИКС»: А.А.Костян.

Примечание: годовая бухгалтерская отчетность в полном объеме размещена на официальном сайте «СтрахЭкспертГрупп» (Главная страница/О компании) по адресу: **http://belbroker.by/finansovaya-otchetnost.html**

ОАО «Завод «Белпласт»

г. Минск, ул. Гусовского 2, УНП 100008342

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ	190	51818	20903
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ	290	9447	10096
БАЛАНС	**300**	**61265**	**30999**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ	490	54205	24649
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	590	405	985
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	690	6655	5365
БАЛАНС	**700**	**61265**	**30999**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

Наименование показателей	Код строки	За январь-декабрь 2014 года	За январь-декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	18 283	19 473
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(13 673)	(14 981)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	4 610	4 492
Управленческие расходы	040	(4 389)	(4 656)
Расходы на реализацию	050	(232)	(313)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	(11)	(477)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	(137)	(288)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)	150	304	416
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150)	160	167	128
Налог на прибыль	170	(79)	(113)
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200)	210	9	13
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	29 534	3 360

Руководитель В.Л. Новаковский
Гл. бухгалтер Г.А. Капусто

Количество акционеров на конец отчетного периода – 143, в том числе: юридических лиц – 4, физических лиц – 139.
Данные отчетности подтверждены аудиторской проверкой ИП Бакумцевой А.В., зарегистрированной решением Мингорисполкома от 2 июня 2000 года №100933651. Бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Завод «Белпласт», сформированная в соответствии с требованиями законодательства РБ по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 01 января 2015 г.
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 31 марта 2015 года.
Собранием акционеров 31 марта 2015 года принято решение: за 2014 год дивиденды не начислять и не выплачивать.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

28 апреля 2015 г. проводит повторный открытый аукцион № 04-Сф-15 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 14 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске (в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме):

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Тенистая, 31 (Первомайский район)	500000000009005569	0,0437	248 667 590	37 000 000	12 150 520
2.	ул. Малый Тростенец, 15А (Заводской район)	500000000002008471	0,1054	436 616 620	65 000 000	12 150 520
3.	пер. Малый Тростенец, 12А (Заводской район)	500000000002008469	0,0922	381 935 900	57 000 000	12 150 520
4.	пер. Малый Тростенец, 7А (Заводской район)	500000000002008472	0,1320	546 807 200	82 000 000	12 150 520
5.	пер. Грибной, 15 (Заводской район)	500000000002008271	0,0545	460 475 470	69 000 000	8 568 882
6.	проектируемый проезд № 3 в бывшей деревне Масюковщина (Фрунзенский район)	500000000006007162	0,0707	808 852 590	121 000 000	8 194 758
7.	проектируемый проезд № 3 в бывшей деревне Масюковщина (Фрунзенский район)	500000000006007161	0,0985	1 126 899 930	169 000 000	8 194 758
8.	ул. Сеченова, 33 (Заводской район)	500000000002008252	0,0492	412 097 700	62 000 000	8 194 758
9.	пер. Братский, 29 (Заводской район)	500000000002008248	0,0541	453 135 450	68 000 000	8 194 758
10.	ул. Охотская, 166 (Заводской район)	500000000002008250	0,0473	396 176 700	60 000 000	8 194 758
11.	проезд Енисейский, 7 (Заводской район)	500000000002008102	0,0478	375 460 800	56 000 000	5 761 190
12.	ул. Чекалина, 49 (Заводской район)	500000000002008104	0,0440	345 602 400	56 000 000	6 100 140
13.	пер. 2-ой Радиаторный № 16 (по перечню) (Фрунзенский район)	500000000006007289	0,0826	1 231 966 610	185 000 000	8 194 758
14.	пер. 2-ой Радиаторный № 17 (по перечню) (Фрунзенский район)	500000000006007195	0,0754	1 124 579 690	169 000 000	8 194 758

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Условия, предусмотренные в решении Минского горисполкома о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 28 апреля 2015 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) **не позднее 23 апреля 2015 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель), которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные гражданами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 8 апреля по 23 апреля 2015 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного, блокированного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72.
Официальный сайт организатора торгов www.mgcn.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

